Дзякуй за тое, што Вы прачыталі гэты нумар. Адгукніцеся, калі ў Вас ёсць заўвагі, меркаванні, прапановы. Тэл. (8 017) 328 68 71

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою.
Якуб КОЛАС

Народная Воля

№ 32 (4490)

21 красавіка 2020 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ЛІСТ З РЭДАКЦЫІ

«Злая слепата»

Артыкул з такой назвай быў надрукаваны ў «Народнай Волі» за 14 красавіка. Як і чакалася, ён выклікаў шалёны рэзананс. Як жа: газета не выключае, што праз нейкі час кампанія «АйПаўэр» зможа запусціць у эксплуатацыю акумулятарны завод, які пабудаваны непадалёку ад Брэста. Логіка выдання жалезная: прадпрыемства ўзведзена, як было напісана, з іголачкі, маецца **станоўчае** заключэнне дзяржаўнай экспертызы, такая ж выснова ўтрымліваецца і ў дакуменце «Галоўдзяржбудэкспертызы», засталося падпісаць апошні акт – і завод выходзіць на тэхналагічныя выпрабаванні абсталявання, сістэм водазабеспячэння, каналізацыі і іншых вытворча-тэхнічных і дапаможных вузлоў.

Можна гадамі «карміць галубоў» на цэнтральнай плошчы Брэста, але працаўнікам акумулятарнага завода трэба зразумець адно: верх павінны браць не эмоцыі, не чыісьці асабістыя інтарэсы, а здаровы сэнс, падмацаваны неабвержнымі фактамі. Сотні тысяч мінчан жывуць у раёнах трактарнага, аўтамабільнага, шарыкападшыпнікавага, рэсорнага і іншых заводаў; суседства з прамысловымі гігантамі, якія, вядома, маюць і шкодныя вытворчасці, безумоўна, не вельмі іх радуе, але ж яны не мітынгуюць, не перакрываюць прахадныя, патрабуючы закрыцця, скажам, таго ж МТЗ. Галоўнае – заводы павінны прымаць усе неабходныя захады для таго, каб не наносіць шкоды як здароўю людзей, так і навакольнаму прыроднаму асяроддзю.

Калі менавіта гэтага больш за два гады дабіваюцца брэсцкія актывісты, то – сцяг ім у рукі. І «Народная Воля», не падліваючы алею ў агонь, у прынцыпе, выказвала такую ж пазіцыю. І трэба спадзявацца, што хутка высокія дзяржаўныя ўстановы, якія нясуць адказнасць і перад законам, і перад грамадскасцю, дадуць «зялёнае святло» на запуск завода, пасля чаго застанецца толькі чакаць высакаякаснай і неабходнай для айчыннай эканомікі прадукцыі, паступлення ў бюджэт немалых падаткаў, высокіх заробкаў вялікай колькасці людзей. Усе – і кампанія «АйПаўэр», і мясцовыя ўлады, і ініцыятыўная частка насельніцтва – прыклалі нямала намаганняў, каб неабходнае для краіны прадпрыемства ўсё ж запрацавала.

Шчыра кажучы, у нейкай ступені незразумелымі выглядаюць у апошнія дні паводзіны старшыні Брэсцкага аблвыканкама А.Ліса. Калі вырашалася пытанне аб выдзяленні з інвестыцыйнага фонду ААТ «АйПаўэр» 5,7 мільёна рублёў, ён займаў менавіта гэтую пасаду. І без яго ўхвалення кампанія не мела б ніякай дапамогі ад дзяржавы. Дзіўна, што А.Ліс цяпер ва ўльтыматыўнай форме запатрабаваў: тэрмінова вяртайце ўсе атрыманыя некалі грошы ў казну. Усё, што было на рахунку ААТ «АйПаўэр», выграблі ў адначассе. Зараз кіраўніцтва кампаніі дамагаецца разблакіроўкі рахунка і просіць дазволу на паэтапны разлік з аблвыканкамам. Іншага выйсця няма – нельга ж паралізаваць усю дзейнасць кампаніі.

Такі штрых. Чамусьці брэсцкія начальнікі не згадваюць, што грошы з інвестыцыйнага фонду выдзяляліся мэтанакіравана – для набыцця абсталявання. У вызначаныя тэрміны яно не проста было закуплена, а да апошняй дэталькі змантавана, гатова хоць заўтра ўключыцца ў работу. Дык з чым звязана грашовая ліхаманка?

Дарэчы, не магу не звярнуць увагу на такую акалічнасць. Калі некалі ААТ «АйПаўэр» звярнулася да брэсцкіх улад з просьбай выдзеліць участак пад будаўніцтва акумулятарнага завода, то не ўзнікала ніякіх праблем. Аператыўна вырашыліся ўсе арганізацыйныя пытанні і, як бачыце, у высокіх абласных чыноўнікаў нават знайшліся грошы для аказання пэўнай дапамогі. Чаму цяпер такі рэзкі паварот на 180 градусаў? Дзе зарыты сабака?

Паколькі я ўзяўся за пяро, то заадно публічна адкажу тым апанентам «Народнай Волі», якія пасля з'яўлення артыкула «Злая слепата» накінуліся на выданне з самымі бруднымі выпадамі. Аказваецца, ёсць асобы, якія нават паверыць не могуць у тое, што за выхад у свет згаданай публікацыі ні рэдакцыі, ні мне, галоўнаму рэдактару, ніхто не заплаціў і капейкі. Што ж, кожны мерае па сабе. А ў нас, народавольцаў, ёсць прынцып: **праўда не прадаецца і не купляецца**. А калі нехта лічыць, што ў матэрыяле ўтрымліваецца неаб'ектыўная інфармацыя, – выкладайце на стол пераканаўчыя факты. З любым апанентам можам сустрэцца ў судзе, калі не знойдзем паразумення ў дыскусіі на старонках газеты.

І яшчэ некалькі слоў хамаватым нядобразычліўцам. Не трэба мяне, заснавальніка, выдаўца і галоўнага рэдактара газеты «Народная Воля», палохаць у інтэрнэт-прасторы тым, што з-за з'яўлення артыкула «Злая слепата» ад выдання адмовяцца многія чытачы. Тыя, хто з намі вось ужо амаль дваццаць пяць гадоў, не адмовяцца. Я выдаю газету для тых людзей, каму патрэбна **ПРАЎДА**, і яны гэта цэняць, а тыя, у каго свярбяць рукі ад фейкавых скандалаў, не былі нашымі сябрамі і не будуць.



Іосіф СЯРЭДЗІЧ,
заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар газеты «Народная Воля».

ОФИЦИАЛЬНО

Больше шести тысяч человек с коронавирусом!

По данным на 20 апреля в Беларуси выздоровели и выписаны 514 пациентов, у которых ранее был подтвержен диагноз COVID-19.

Вот какую статистику вчера во второй половине дня обнародовал Минздрав: *«С начала февраля в Беларуси проведено 102 тысяч 556 тестов на коронавирусную инфекцию. В круглосуточном режиме специалисты лабораторий, которые открыты как в республиканских научно-практических центрах и в центрах гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья, так и в частных медицинских центрах проводят проверку тестов на COVID-19. На этой неделе начинается внедрение экспресс-тестов в амбулаторном и стационарном звене.*

На утро субботы (18 апреля) было зарегистрировано 518 новых случаев, на утро воскресенья (19 апреля) – 510, за последние сутки – 457.

Всего, по данным на 20 апреля, зарегистрировано 6264 положительных теста на COVID-19: в Брестской области – 185, Витебской – 1504, Гомельской – 322, Гродненской – 176, Минской – 789, Могилевской – 265, Минске – 3023.

Выписаны по выздоровлению – 514 человек.

В особом внимании специалистов, в связи с тяжестью заболевания, нуждаются 92 человека.

Умер 51 пациент с рядом хронических заболеваний с выявленной коронавирусной инфекцией».

Вера ВИР.

ГАЗЕТА – ЧЫТАЧЫ

«Народная Воля» — за ПРАЎДУ! Далучайцеся да нас!

Так, «Народная Воля» не з'яўляецца рупарам ні ўлад, ні апазіцыі, ні фінансавых алігархаў, ні…

Для «Народнай Волі» няма нічога больш важнага, чым змагацца за **ПРАЎДУ**.

Нялёгкая гэта справа, асабліва ў сённяшні час, калі розныя інтэрнэт-тэхналогіі далі разгул усялякім брудным фейкам. Але «Народная Воля» бараніла і бароніць толькі **ПРАЎДУ**.

Усяго некалькі дзён засталося, каб падпісацца на «Народную Волю» на май-чэрвень. Мы звяртаемся з просьбай да нашых сталых чытачоў: дапамажыце далучыцца да «Народнай Волі» сваім сябрам, суседзям, саслужыўцам, якія дагэтуль не з'яўляліся яе падпісчыкамі. Нагадайце ім, што аформіць падпіску можна ў любым паштовым аддзяленні ці ў спецыялізаваным пункце «Белсаюздруку».

Можна аформіць падпіску на «Народную Волю» і не выходзячы з дома. Для гэтага трэба на сайце **belpressa.by** запоўніць падпісны бланк і зрабіць аплату **праз сістэму Webpay** банкаўскай карткай ці **праз сістэму «Расчет» (АРІП)**. У апошнім выпадку неабходна выбраць пункт **«Система «Расчет» (ЕРИП)» – «СМИ» – «Н» – «Народная Воля» – «Подписка».** Для аплаты трэба ўвесці нумар рахунка, атрыманага на сайце **belpressa.by**. Зрабіце плацеж.

Хто за ПРАЎДУ — той з намі!

Рэдакцыя газеты «Народная Воля».

ЗА ПРАХАДНОЙ

Хто і як працуе падчас пандэміі?

Пандэмія каранавіруса, што разыгралася ў свеце, не толькі вялікая медыцынская, сацыяльная і псіхалагічная праблема. Гэта яшчэ і эканамічнае выпрабаванне. МВФ прадказвае спад ва ўсім свеце. У Беларусі, у прыватнасці, падзенне валавога ўнутранага прадукту можа дасягнуць сёлета 6%. Белстат тым часам падае, што за першы квартал ВУП у краіне знізіўся толькі на 0,3% у параўнанні з мінулым годам.

«Народная Воля» пацікавілася, ці паўплывала пандэмія каранавіруса на працу прадпрыемстваў. Адмыслова выбіраліся прадпрыемствы, якія адносяцца да розных галін нацыянальнай эканомікі.

ААТ «Мазырскі НПЗ»

«Наш завод зараз працуе ў аптымальным тэхналагічным рэжыме. Выпускаем поўны асартымент таварнай прадукцыі, якая адпавядае міжнародным стандартам якасці», – тлумачыць сітуацыю намеснік генеральнага дырэктара акцыянернага таварыства на ідэалогіі, персанале і сацыяльным развіцці МНПЗ **Генадзь Цецярук**.



За першы квартал прадпрыемства перапрацавала толькі каля паўтара мільёна тон нафты. З прычыны недахопу сыравіны сутачная загрузка ў першыя месяцы года складала ўсяго 16 тысяч тон. У гэтыя красавіцкія дні завод перарабляе ўжо па 28 тысяч тон нафты за суткі. Гэта звычайная загрузка завода.

Сітуацыя змянілася ў лепшы бок пасля таго, як у сярэдзіне сакавіка 250 тысяч тон азербайджанскай нафты з трох танкераў у Адэсе паступілі праз нафтаправод у Мазыр. На тое была дамоўленасць канцэрна «Белнафтахім» з Дзяржаўнай нафтавай кампаніяй Азербайджана (Socar Trading). Цяпер пастаўкі нафты ідуць таксама і з Расіі – праз нафтаправод «Дружба».

Паводле слоў Генадзя Цецерука, яшчэ ў сакавіку прадпрыемства закупіла па 10 шматразовых масак для кожнага супрацоўніка, каб людзі маглі засцерагацца ад небяспечных вірусаў і на працы, і ў грамадскіх месцах. Паўсюдна ў вытворчых падраздзяленнях акцыянернага таварыства маюцца антысептыкі.

Адначасова на заводзе пастараліся развесці вытворчыя патокі працаўнікоў – каб рабочыя і спецыялісты менш сутыкаліся разам пры перазменках ці ў любых іншых абставінах, то адпаведна і рызыкі будзе менш нарвацца на інфекцыю.

Змяніўся ў сувязі з пандэміяй і рэжым працы трамвайнага ўпраўлення. З трэцяга красавіка арганізаваны дадатковыя рэйсы трамваяў з горада на завод – тры раніцай і столькі ж вечарам. Разлік на тое, што напаўняльнасць вагонаў меншая, а значыць, нафтаперапрацоўшчыкам можна трымаць большую дыстанцыю адзін ад аднаго. Рэгулярна праводзіцца дэзінфекцыя вагонаў.

На НПЗ працуе звыш 5 тысяч чалавек. Да велікодных святаў, паводле сцвярджэння намесніка генеральнага дырэктара, у калектыве не было нейкіх надзвычайных здарэнняў, выкліканых каранавіруснай інфекцыяй.

Беларускі металургічны завод

На БМЗ у Жлобіне, паводле інфармацыі прэс-сакратара прадпрыемства **Аляксандра Алесіка**, часова адменены масавыя мерапрыемствы. Паўсюдна ў месцах агульнага карыстання ўсталяваны дазатары з антысептыкам. У два патокі стала працаваць медыка-санітарная служба завода.

Ва ўсіх кіроўцаў, якія прыязджаюць на загрузку прадукцыі, абавязкова вымяраюць тэмпературу, і толькі пасля гэтага яны трапляюць на тэрыторыю прадпрыемства. Супрацоўнікі БМЗ, якія заняты на адгрузцы і кантактуюць з кіроўцамі, захоўваюць масачны рэжым.

Спіс ахоўных мерапрыемстваў па прафілактыцы каранавіруса на заводзе даволі вялікі, і ён пастаянна папаўняецца новымі пунктамі.

Металлургічны завод – буйны экспарцёр, адначасна ён сам імпартуе шмат сыравіны і матэрыялаў. Нягледзячы на новыя выклікі часу, сярод якіх і пандэмія каранавіруса, кіраўніцтву ўдаецца аператыўна вырашаць надзённыя праблемы і забяспечваць устойлівую працу калектыву прадпрыемства ў аптымальным рэжыме.

Асноўныя вытворчыя паказчыкі БМЗ за першы квартал – на ўзроўні адпаведнага перыяду мінулага года. Па некаторых назіраецца рост. Выпушчана амаль 700 тысяч тон сталі, 635 тысяч тон пракату, 26 тысяч тон труб, 94 тысячы тон металакорду, бранзаванага дроту. Больш як 85 працэнтаў выраблены на заводзе прадукцыі рэалізавана на экспарт. Спажыўцамі яе сталі 45 краін свету.

ААТ «Калінкавіцкі мясакамбінат»

Камбінат у Калінкавічах на рынку мясапрадуктаў існуе 90 гадоў – сёлета ў яго юбілей. Гэта буйнейшае на Гомельшчыне прадпрыемства гэтай галіны. Тут перарабляюць за суткі да 120 тон ялавічыны і свініны. Стаўку ў калектыве зрабілі на тэхнічнае пераўзбраенне, без якога няма руху наперад. Немагчыма без абнаўлення палепшыць ўмовы працы, побыту і адпачынку працаўнікоў.

За апошнія тры гады на мясакамбінаце рэканструявалі ўбойны цэх, дзе начальнікам плённа працуе **Алена Лобах**. Закупілі нямецкае абсталяванне ў каўбасны цэх – яго паспяхова асвоілі працаўнікі цэха пад кіраўніцтвам **Наталлі Дуброўскай**.

Зараз вядзецца рэканструкцыя халадзільніка. Больш разнастайным стаў асартымент прадукцыі. Ухіл зроблены на вырабы на аснове традыцыйнай народнай рэцэптуры, якія вызначаюцца арыгінальным смакам і выпускаюцца пад брэндам «Вялікае княства». Тут сыравяленая «Дзедаўская закуска», «Закуска вясковая», «Паляндвіца», далікатэсы «Сялінскі», «Панскі», салямі «Венецыянская-люкс», сасіскі і сардэлькі, кансервы, пельмені, цэлая гама мясных прадуктаў з ялавічыны, свініны і птушкі. Вырабляе камбінат студзені і паштэты.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

«И мысли не было спасать экономику, спасали людей»

Рудый об опыте Китая в борьбе с коронавирусом

Самый известный экономист и идейный вдохновитель либералов-реформаторов, экс-посол Беларуси в Китае и экс-советник президента Беларуси Кирилл Рудый оставил госслужбу, став независимым директором инвестиционной онлайн-платформы Finstore.by, проекта Банка БелВЭБ. О том, как Китаю удалось быстро победить эпидемию, какие Беларуси нужны чиновники и почему и сейчас китайские компании в Беларуси ежедневно отчитываются на родину не о выручке, а о температуре работников, рассказал Кирилл Рудый.

Китай победил быстро и малыми жертвами. Как?

– Опыт Китая в самых разных областях традиционно весьма востребован в Беларуси, но с пандемией вопрос особый. Она в Китае началась, достаточно быстро закончилась, но вопросы остались. Про заблокированный жестким карантином Ухань известно, а что происходило в Пекине? И как на это реагировали люди?

– Мы смотрим на Китай через свои стереотипы. Видим то, что хотим увидеть. Да, Китай не сразу понял, что происходит. Был первым. Но потом сориентировался. Изменился до неузнаваемости и победил быстрее и с меньшими жертвами. Как?

Во-первых, передал полномочия на места. Власти городов сами принимали решения закрывать дорогу или населенный пункт на карантин, а школы и университеты – когда отменять учебу. Если результата не было и число заразившихся росло, то Пекин принимал кадровое решение и менял местного руководителя.

Во-вторых, общество самоорганизовалось. Возникли местные дружины, блокирующие свои деревни. Бизнес бросился по миру закупать маски. Оказывали помощь неправительственные организации, в том числе международные. Даже белорусский самолет с гуманитарной помощью китайские власти сперва не знали, как оформить, а груз принимала частная компания, которая отправила его в Ухань.

В-третьих, Китай вооружился ИТ. Были мобильные приложения, в которых отмечались заболевшие, их контакты, и каждый видел, от кого следует дистанцироваться.

(Окончание на 2-й стр.)



СОЛИДАРНОСТЬ

Это подвиг!





Вчера представители кампаний ЕРАМ и Wargaming передали Минздраву 700.000 фильтрующих масок высокого класса защиты.

Эти средства индивидуальной защиты рекомендованы Всемирной организацией здравоохранения для использования медицинскими работниками при оказании помощи пациентам.

«Объединив наши усилия, мы хотим оказать реальную помощь в защите тех, кто работает на пределе своих сил и от кого зависит наше с вами здоровье и будущее, – говорится в общем заявлении ЕРАМ и Минского центра разработки компании Wargaming (СООО «Гейм Стрим»). – *Эти средства получат все, кто сейчас на передовой борьбы с вирусом COVID-19. Мы хотим выразить им слова благодарности»*.

Респираторы были доставлены в страну при поддержке представительства компании «3М» в Беларуси. Также благотворители выразили благодарность платформе «Имена» и компании Melsoft Games – без их непосредственного участия доставка средств защиты в кратчайшие сроки была бы невозможной.

«Сейчас непростое время для всех стран, – отметил заместитель министра здравоохранения **Борис Андросюк** (*на фото*). – *Осуществить такую поставку в сжатые сроки (в течение 10 дней с момента закупки) – это подвиг. Средства защиты сейчас быстро расходятся, они значительно повышают безопасность работы наших врачей, медсестер, фельдшеров, санитарок. И хочу поблагодарить людей, которые проявляют свою активную жизненную позицию»*.

БУДЗЕМ ЖЫЦЬ!

Людзі ахвяруюць

На два дабрачынныя рахункі Міністэрства аховы здароўя штодня паступаюць сродкі ад фірмаў і прыватных асоб для барацьбы з распаўсюджваннем COVID-19. З 25 сакавіка па раніцу 17 красавіка пералічана 5,3 мільёна рублёў і 79 тысяч еўра. У дабрачыннасці ўзялі ўдзел 348 юрыдычных асоб – ад іх паступіла больш за 4 мільёны рублёў. Ад фізічных асоб паступіла сума 1,08 мільёна рублёў. На валютны рахунак пералічылі ахвяраванні 11 фізічных асоб і дзве юрыдычныя.

На ахвяраванні былі набыты маскі, супрацьаэразольныя паўмаскі, камбінезоны медыцынскага прызначэння, стаматалагічныя ахоўныя экраны, наборы рэагентаў для выяўлення COVID-19 – усяго выдаткавана пакуль каля 1,5 мільёна рублёў.

Таксама стала вядома, што 45.000 рублёў пералічыў на дабрачынны рахунак вядомы прадпрымальнік і мецэнат **Юрый Зісер**.

Алена МАЛОЧКА.

ЗА ПАРТАЙ

Згодна з раскладам, але праз інтэрнет

Студэнты ўніверсітэта імя Янкі Купалы перайшлі на анлайн-навучанне. Папярэдне мяркуецца, што такая форма навучання працягнецца да 8 мая.

Выкладчыкі падчас анлайн-лекцый змогуць адсачыць прысутнасць студэнтаў на занятках, пабачыць іх актыўнасць на адукацыйным партале, ацаніць выкананую імі працу. Ёсць таксама магчымасць праводзіць анлайн-кансультацыі.

Усё гэта дазволіць захаваць здароўе студэнтаў і выкладчыкаў, скараціць непасрэдныя кантакты паміж імі, мінімізаваць перамяшчэнні ў грамадскім транспарце і знаходжанне ў грамадскіх месцах.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

«И мысли не было спасать экономику, спасали людей»

Рудый об опыте Китая в борьбе с коронавирусом

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Давали одно разрешение на семью для оплаты через WeChat, чтобы в магазин шел только один человек. Сканировали QR-коды при входе в здания, чтобы знать маршрут человека. Постоянно измеряли температуру.

Сегодня, похоже, Россия использует китайский опыт.

– Когда в посольстве Беларуси в Пекине надели маски, завели санитайзеры? Как организовывали эвакуацию?

– В посольстве отреагировали сразу, как узнали. Не проживающим в посольстве можно было не ходить на работу, коллеги из Минска купили и передали нам маски.

Тогда мы занимались эвакуацией граждан. Спасибо, помогли казахи. Хотя мы планировали из некоторых городов даже машинами вывозить. Правда, сразу многие наши граждане не выходили даже на связь. Через их интервью и соцсети мы сами нашли многих. Не все понимали, зачем уезжать. Отказывались. Тогда пустили информацию в СМИ, надеясь, что родственники прочитают и окажут давление. Порой так и получалось.

– Что из китайского опыта стоило бы использовать в Беларуси?

– В Китае во время коронавируса был такой лозунг «Верь науке!». Начинается все с того, во что мы верим. Так и относимся, так и действуем. Такие и результаты.

– Официальной статистике по заболевшим, умершим, протестированным в Китае верят?

– Другой нет. Да и как можно придираться к китайской статистике, если поначалу и тестов не было, и вирус не определен был? Все в первый раз. Думаю, власти Китая сразу сами точно не знали. Боролись с неизвестностью. Главное – выжить.

Разговоры о политике, экономике тогда были просто неуместны и бесчеловечны. Даже сейчас китайские компании, которые работают в Беларуси, ежедневно отчитываются в Китай не о своей выручке, а о температуре своих работников, прикладывая фотографии градусников.

– А вообще важно, верят властям или не верят? В конце концов, сейчас источников информации много, можно и без указания властей дистанцироваться, экипироваться, изолироваться…

– В чрезвычайных ситуациях все смотрят на власть. Там вся информация, компетенция, ресурсы. До выступления в СМИ Си Цзиньпина 20 января 2020 года мы в посольстве проводили встречи с делегациями из Уханя. Потом за день все поменялось.

Конечно, можно без указаний властей делать по-своему. Но так, кажется, будет дольше, если по улицам будут другие ходить и разносить вирус. Это вызов не отдельному человеку, а среде обитания, обществу. Китайцы сплотились и победили.

– Сейчас, когда многие страны уже прикидывают масштабы падения экономики, все тоже ориентируются на Китай. ВВП Китая в первом квартале упал на 6,8%. Кто-то ожидал большего падения, кто-то меньшего. На ваш взгляд, это много или мало?

– Повторю: в Китае тогда и мысли не было о спасении экономики, спасали людей. Сейчас посчитали первый квартал: да, падение 6,8%. Но в годовом выражении это означает, что прирост сократится с 6,1% в прошлом году до 2–3% в этом, а в ближайшие три года среднегодовой темп составит 3–5%.

Если в годовом исчислении упадут США и ЕС, то Китай будет вытягивать мировую экономику. Поэтому это скорее не падение, а замедление. Пока китайцы продолжают свои реформы и открываются, они не упадут.

– Ваша оценка: это дорого за ту траекторию заболевших, с которой прошел эпидемию Китай?

– Оценивать свою жизнь, или вашу, или чье-либо здоровье в доходах других людей не буду. Сейчас главное не заболеть, потом все остальное.

– Завершим китайскую тему анонсом последней части вашей трилогии, которая выйдет в июле под названием «Непохожие». Совсем непохожие?

– Это одновременно монография, практическое пособие и мемуары (пока в памяти свежо). «Непохожие», потому что когда-то китайцы были похожими на нас. Но они пошли дальше. Изменился уровень, качество жизни, ценности. Теперь они непохожие. Сходства есть, и читатель сам их найдет. В усилившейся централизации власти, в постоянстве борьбы с коррупцией, в отношении к СССР и ином. Но отличий уже все больше. У каждого свои правила и взгляды. Отсюда, кстати, и проблемы по некоторым проектам.

– И чем именно и где больше всего непохожие?

– Оставлю интригу. В книге этому посвящена глава «Железные братья». Там описываются отличия не только на основе наблюдений, но и сравнений белорусов и китайцев по Всемирному обзору ценностей.

Приведу жизненный пример нашей непохожести. Был такой случай, когда возле нашего посольства жители соседнего дома парковали машины. Мы пожаловались в полицию. Никакой реакции. Тогда на одной из встреч с замминистра общественной безопасности Китая я поднял этот вопрос. Через пару дней приехали полицейские с эвакуатором. Но! На улицу вышли местные жители и отогнали полицейских от своих машин (!!!). Через пару месяцев уже на встрече с китайским министром общественной безопасности я вновь напомнил про свой вопрос. На этот раз на нашей улице установили видеокамеры и приварили столбики, чтобы не парковались. Для меня это непохожая на нас история: от реакции полиции до реакции людей и решения с помощью ИТ.

– Кстати, почему трилогия? Не замахнуться ли на пятикнижие, к примеру?

– «Финансовая диета» – про экономику. «Потому что так решили мы» – про социологию. «Непохожие» – про политику. Последняя, надеюсь, покажет, что решения внутренних проблем в экономике надо искать не вовне, а внутри, в том числе по предложенным в первых двух книгах рецептам. Такой вот цикл.

И каждая книга выходит под стрессом. Первая – после падения белорусской экономики (была какая-то ответственность за это). Вторая – после смерти отца. Третья – после смены работы. Надеюсь, дальше будет без стресса.

– Четыре года за пределами страны – это достаточно, чтобы по прибытии взглянуть на родину новыми глазами. Что поменялось? Нравы? Настроения?

– Командировка была меньше четырех лет. Отвык от русской речи на улицах. Раньше как-то не замечал, что ли, но теперь режет слух мат на улицах, в том числе на детских площадках.

В целом поменялось не много. Хотя нет – за последний месяц меняется. Я уже недель пять, наверное, хожу в медицинской маске. Сразу на улице неодобрительно поглядывали, в очереди в магазине обсуждали, один знакомый даже сказал: «Это неполиткорректно». Теперь все продавцы в магазинах в масках. На улицах люди в масках появились. Что-то в голове меняется.

В Сингапуре увидел, какие нам нужны чиновники

– Самый ценный опыт и самое большое разочарование от госслужбы?

– Замминистра коммерции Китая, когда мы с ним прощались, сказал: «*Не каждый госслужащий может увидеть результаты своего труда, а вам повезло*». Думаю, самый ценный опыт тот, который принес удовлетворение. Вырос экспорт, пришли прямые китайские инвестиции, даже три памятника белорусам появились в Китае. Сам себе доказал, что ничего невозможного нет.

Разочарования, конечно, были. Но от одного провала к другому, и потом вдруг что-то получается. Затем уже и не вспоминаешь эти разочарования. Честно, уже и не помню.

– Известна ваша речь о том, какие нужны экономисты. А какие чиновники нужны? Я про оба смысла этой фразы – и какие чиновники нужны стране для нормального поступательного развития, роста благосостояния граждан и т.п., и какие чиновники нужны в Беларуси.

– В 2017 году был на белорусско-азиатском форуме в Сингапуре. Там увидел, какие нам нужны чиновники. Создаются условия, и они приходят сами. Нужны три условия.

Первое – гарантия безопасности. Защита от доносов, клеветы. Гарантия работы на одной должности минимум 3–5 лет (на практике в Сингапуре дольше). Чиновник там знает более или менее, на какой должности будет через 15–20 лет.

Второе – зарплата. На две трети она зависит от средней зарплаты нескольких десятков топ-менеджеров в разных отраслях, а на треть – от KPI. Тогда нет соблазна коррупции, и нет стимула идти в бизнес.

Третье – четкие полномочия и обучение. Каждый год чиновник должен пройти повышение квалификации в течение 100 часов у лучших в мире профессоров и топ-менеджеров.

– Насколько я знаю, дефицита предложений о трудоустройстве у вас не было. Почему бывший ИТ-скептик выбрал финтех? Семья обрадовалась вашему выбору?

– Смена работы всегда стресс. Дело не в предложениях, а в людях. Многие меня поддержали. Спасибо. Выбрал финансы. Это моя специальность по диплому. А финтех – одно из направлений. На макроуровне можно быть ИТ-скептиком, на микро – это просто работа. Да, и еще: после того как пробыл около 10 лет в Китае, это уже для меня вторая родина. Поэтому работа и на китайском направлении меня всегда найдет.

Семья, конечно, довольна. Это важно. Мама перестала бояться, но теперь волнуется, что такое токены и независимый директор.

– А закончите какой-нибудь оптимистичной китайской мудростью, а то нас вечно за пессимизм критикуют.

– Есть такое китайское выражение: «Мышь попала в чан с зерном». Оно означает, что нет худа без добра. Надеюсь, что в этом коронавирусе и мы найдем свое зерно мудрости.

Ольга ЛОЙКО.
TUT.BY.



ЭКАНОМІКА

Ніхто не хоча скардзіцца

Эксперты прагназуюць значны спад у эканоміцы краіны. «Народная Воля» ў сваю чаргу пацікавілася, як падчас пандэміі каранавіруса працуюць прамысловыя прадпрыемствы Гродна з рознай формай уласнасці.

ААТ «Гродна-Азот»: «Спраўляемся са сваім праблемамі»

Адно з самых буйных прадпрыемстваў у Гродзенскай вобласці ААТ «Гродна-Азот» ва ўмовах каранавіруса працуе пры няпоўнай загрузцы вытворчасці. Сітуацыя на рынку нафты прывяла да таго, што рэзка панізіўся кошт прадукцыі прадпрыемства, парушыўся графік яе дастаўкі ў замежжа.

Тым не менш, паводле слоў намесніка дырэктара па ідэалагічнай рабоце **Рамуальда Барсука**, прадпрыемства працуе і спраўляецца са сваімі праблемамі. Распрацаваны цэлы шэраг мерапрыемстваў на час дзейнасці ва ўмовах каранавіруса.

«*Мы нікога за гэты перыяд не скарацілі. Наладзілі выпуск дэзінфікуючых сродкаў, для працоўнага калектыву закуплены медыцынскія маскі,* – расказвае Рамуальд Эдвардавіч. – *Кожны дзень праводзім адпаведную апрацоўку памяшканняў, у тым ліку абсталявання, прахадных, сталовак, праводзім апрацоўку транспарту, які заязджае на тэрыторыю*».

Пачынаючы з лютага, калі толькі з'явілася інфармацыя аб каранавірусе, на «Гродна-Азот» нікога не адпраўляюць у замежныя камандзіроўкі. Сярод работнікаў прадпрыемства няма інфікаваных каранавірусам. Праўда, ідэолаг распавядае, што ёсць работнікі, якія мелі кантакты першага ўзроўню, – ім адразу прапанавалі ўзяць адпачынкі на перыяд самаізаляцыі.

«*У гэтым сэнсе мы імкнёмся працаваць на апярэджанне,* – канстатуе Рамуальд Барсук. – *Мы нават арганізавалі падвоз людзей у час пік сваімі аўтобусамі, каб здаралася менш кантактаў у грамадскім транспарце. Арганізавалі дастаўку абедаў на працоўныя месцы, зрабілі новыя графікі ў сталоўках, каб людзі як мага меней маглі перасякацца*».

«Мэбля-Нёман»: «У нас большасць работнікаў у адпачынках»

На прадпрыемстве «Мэбля-Нёман» распачаўся традыцыйны сезон адпачынкаў. Фабрыка працуе, але ў гэты перыяд ёй кіруе галоўны бухгалтар, паколькі і дырэктар, і галоўны інжынер таксама ў водпуску.

«*У нас у цэхах зараз усяго па некалькі чалавек працуе,* – распавялі «Народнай Волі» ў аддзеле продажаў. – *Прадукцыю зараз робім толькі на ўнутраны рынак, бо граніцы з іншымі краінамі закрыты*».

На фабрыцы строга прытрымліваюцца мераў засцярогі ад каранавіруса. Усе работнікі працуюць у масках, у адпаведных месцах устаноўлены дэзінфектары для рук. Работнікі спадзяюцца, што ўжо летам іх вытворчасць запрацуе на поўную моц.

«Малочны мір»: «Мы павялічылі колькасць фундатарскай дапамогі»

«Малочны Мір» адзін з лідараў сярод прадпрыемстваў харчовай прамысловасці ў рэгіёне. І, як заўважае намеснік дырэктара па ідэалогіі **Аксана Вішнеўская**, санітарныя нормы тут заўсёды даволі строгія, а з прыходам каранавіруса яны сталі яшчэ больш жорсткія.

Рэжым працы на вытворчасці не змяніўся, прадукцыі выпускаецца столькі ж, адзінае, са слоў ідэолага, больш жорсткім стаў кантроль за ее якасцю.

«*Кожны работнік, калі прыходзіць на змену, атрымлівае пакет з маскай і пальчаткамі, паўсюль развешаны дэзінфектары і інструкцыі. Абмежаваны ўваход на тэрыторыю завода. Увесь транспарт, які заязджае на прадпрыемства, праходзіць апрацоўку адпаведнымі сродкамі*», – канстатуе Вішнеўская.

На прадпрыемстве не было людзей, інфікаваных каранавірусам, а таксама тых, хто меў кантакты першага ці другога ўзроўню.

І яшчэ на адну важную акалічнасць звяртае ўвагу намеснік дырэктара па ідэалогіі: за час пасля з'яўлення каранавіруса прадпрыемства значна павялічыла спонсарскую дапамогу для гродзенскіх шпіталяў і работнікаў медыцыны.

«*У абласны інфекцыйны шпіталь і гарадскі кожвендыспансер мы вазілі прадукты харчавання і пералічвалі грошы на іх патрэбы,* – кажа Аксана Барысаўна. – *Прычым харчаванне вазілі для ўсяго персаналу шпіталяў, а не толькі для дактароў. Акрамя гэтага, мы пералічвалі грошы ўстановам аховы здароўя ў тых гарадах вобласці, дзе знаходзяцца філіялы нашага прадпрыемства*».

«КрысталТранс»: «За перыяд каранавіруса мы не звольнілі ні аднаго чалавека»

Прыватная кампанія «КрысталТранс» займаецца міжнароднымі і ўнутранымі грузавымі перавозкамі. Першае, што заўважае яе камерцыйны дырэктар **Аляксандр Старахатні**: пакуль ніводзін кіроўца не захварэў на каранавірус, хаця фуры кампаніі працягваюць ездзіць як на Захад, так і ў Расію.

Першапачаткова былі праблемы паколькі ў Еўрасаюзе ўсе краіны пазакрывалі межы паміж сабой. І на ўсходнім накірунку фуры падоўгу стаялі на расійскай граніцы, але з часам усё неяк наладзілася.

«*Справа ў тым, што беларускія перавозчыкі, як правіла, працуюць на трэція краіны, а паколькі ў Еўропе і Расіі многія прадпрыемствы спынілі працу, стала меней работы і ў нас*», – канстатуе Старахатні.

Са слоў камерцыйнага дырэктара, міжнародныя перавозкі за час каранавіруса знізіліся на 30%, праўда, павялічылася колькасць перавозак унутры Беларусі. Кампанія імкнецца выжываць у гэтых умовах.

Што датычыцца працы кіроўцаў фур у час пандэміі каранавіруса, то яны забяспечваюцца ўсімі неабходнымі сродкамі засцярогі, якія рэкамендуюцца мінздравамі не толькі Беларусі, але і краін, куды накіроўваецца машына.

«*Амаль усе краіны паўводзілі свае адмысловыя інструкцыі знаходжання ў іх, а таму мы абавязкова знаёмім з імі сваіх кіроўцаў,* – гаворыць Старахатні. – *Кабіна аўтамабіля цяпер стала сапраўдным домам для нашых работнікаў, мы просім іх знаходзіцца там і па магчымасці не адлучацца*».

За перыяд эпідэміі ў кампаніі не звольнілі ніводнага чалавека. Праўда, усё ж такі давядзецца адпраўляць частку людзей у вымушаныя адпачынкі, прызнае Аляксандр Акімавіч.

«*Пытанне гэта няпростае, паколькі не ўсе пагаджаюцца, але ў нас кампанія прыватная, і нам няма на каго разлічваць. Нам вельмі важна, каб людзі, якія ў нас працуюць, усё гэта разумелі*», – заўважае Аляксандр Старахатні.

Міхал КАРНЕВІЧ.

АКТУАЛИИ



Светлана КАЛИНКИНА

Стыдоба!

В то время когда белорусы всем миром собирают деньги на закупку для больниц аппаратов искусственной вентиляции легких, кислородных концентраторов, пульсоксиметров, средств защиты для медиков (респираторов, масок, бахил, щитков и т.д. и т.п.), но начальству Миорского райисполкома понадобился новый автомобиль.

Чиновники объявили тендер, уведомив, что желают приобрести пятиместную машину с 1,8-литровым бензиновым двигателем и 6-ступенчатой автоматической коробкой переключения передач. И, судя по техническому заданию и примерной цене (более 58 тысяч рублей), им понравился «Geely Atlas» в самой роскошной комплектации «Luxury (LED) 4G».

В период пандемии как вообще можно сравнивать – больницы с их нуждами, новые аппараты ИВЛ и новый автомобиль? Но какому-то чиновнику, прямо скажем, не самого богатого региона именно сейчас (нет бы подождать!) приспичило утопить свою задницу в сиденьях люксового авто. А потом с ветерком да комфортом поехать по району с рассказами о заботе про нужды простого народа и государства в целом. И деньги нашлись.

Мы удивлены? Нет. Вот если бы какой-то чиновник продал свое авто, отдав деньги на помощь медикам, мы удивились бы. А так – обычное дело.

Не удивил и министр спорта Сергей Ковальчук. Когда некоторые из-за кризиса уже потеряли работу или готовятся ее потерять и ясно понимают перспективу серьезного сокращения зарплат, министр Ковальчук рассказал, что спортсмены из-за отмены соревнований не пострадают. Зарплаты нашим атлетам будут выплачиваться так, будто они во всех отмененных международных турнирах участвовали.

Надо понимать, спортсмены у нас – самая незащищенная часть населения, а спорт – самая важная отрасль для государства. Может, им еще за отмененные соревнования начислить вознаграждение как победителям и призерам? Мы что, теперь должны поаплодировать такой заботе о спорте?..

Если министр не понимает, то я объясню: он похвастался намерением оставить сытное меню для спортсменов, когда всем остальным придется затянуть пояса. И ничего хорошего в этом нет. Это плохо, и это стыдно. Тем более что весь мир теперь осознал: если бы миллионные зарплаты были не у футболистов-хоккеистов, а у микробиологов, то мы уже имели бы вакцину против коронавируса и не считали бы гробы сотнями тысяч. Только министр Ковальчук до сих пор все еще ничего не понял и зачем-то вещает о зарплатах спортсменов так, будто это они, а не медики, сегодня спасают жизни.

Ну и наконец третий возмутительный кейс последних дней – парад. Врачи умоляют, уговаривают, убеждают в период эпидемии не посещать места массовых мероприятий, просят оставаться дома, поберечь себя и своих близких. Но нет, белорусские ветераны потребовали: «Парад 9 Мая должен быть!»

Российские ветеранские организации из-за коронавируса попросили президента Владимира Путина перенести парад в честь 75-летия Победы в Москве, а наши, наоборот, подбросили поленьев в костерок. «В Беларуси, мы считаем, такой необходимости нет. Ситуация позволяет провести парад 9 Мая», – говорится в комментарии Белорусского общественного объединения ветеранов.

И сколько же лживого в этом заявлении! 12 апреля в Бресте на 98-м году жизни умер ветеран Великой Отечественной войны Аркадий Бляхер. Он был **последним в городе ветераном**, который встретил Победу в звании офицера. Ушел последний офицер той страшной войны!!! Но похоронили Аркадия Моисеевича тихо, без больших траурных мероприятий. Потому что коронавирус и сложная эпидемическая ситуация...

Получается, особо торжественно и с почестями похоронить настоящего ветерана, последнего офицера Великой Отечественной, жившего в городе над Бугом, в нынешних условиях было нельзя. А провести парад на 9 Мая в Минске «ситуация позволяет»?!

Цинизм зашкаливает!

Меня учили, несмотря ни на что, уважать седины. Но тут пример того, когда у людей, выступающих с заявлением, есть огромное желание угодить вышестоящему, но нет совести. Потому что, во-первых, к 9 Мая они не имеют никакого отношения, поскольку о той войне только в книжках читали. А во-вторых, побоявшись торжественно похоронить настоящего ветерана, просто постеснялись бы выступать с заявлениями. Молчали бы уж!

В сложные времена проявляются и самые лучшие, и самые худшие качества людей. Нынешняя эпидемия коронавируса, которая по всему миру косит жизни, конечно, ситуация сложная. И пока одни спасают людей или стараются чем могут помочь докторам, другие пристраиваются и выслуживаются. И это так мерзко, что хочется помыть руки. Не из-за коронавируса, а потому что противно и стыдно.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Вера СТРЕМКОВСКАЯ: «В Швеции не принято делать замечание другому человеку!»

В Швеции и в Беларуси не объявляли карантин из-за коронавируса. Носят ли жители Швеции маски? Доверяют ли официальной статистике? Отпускают ли детей в школу? Обо всем этом «Народной Воле» рассказала известный в прошлом белорусский адвокат Вера Стремковская, которая больше 10 лет живет в Гетеборге.



– Вера Валентиновна, в Беларуси сегодня многие проблемы и новости отошли на второй план. Тема номер один – коронавирус. В Швеции так же? У нас в обществе мнения, кстати, разделились: одни выступают за жесткий карантин, другие категорически против…

– В Швеции карантин не вводили. Но у нас ведомства принимают рекомендации, которые почти как закон. Здесь вообще не принято резко указывать, наказывать, система построена на доверии к человеку. Но рекомендации – это прямое указание к действию. Государство обращается к человеку с расчетом на уважительное отношение. В каких-то случаях это срабатывает, в каких-то – нет. Как обыватель, погруженный в местный быт и повседневную жизнь, я вижу: некоторые проявляют эгоизм вместо того, чтобы проявлять солидарность, некоторые ставят превыше всего собственное благополучие. Конечно, это имеет свои последствия. И лично я ощущаю дискомфорт или страх, когда иду в магазин, потому что у нас нет масок – их нет даже в магазинах, невозможно купить в аптеке или заказать в интернете. В продаже нет антисептиков – все сейчас отдали в больницы, туда, где все это требуется прежде всего.

Ежедневно в 14 часов проходит пресс-конференция, выступают представители социальных служб, бюро по трудоустройству, Министерства здравоохранения. Рассказывают, какая ситуация в стране, что происходит. Это все транслируется в прямом эфире. И вот только на днях объявили, что поступила большая партия масок, защитных средств и антисептиков, которые собираются распределить по коммунам – это здесь как области. И, возможно, маски появятся в продаже. А может, снова будут направлены для нужд здравоохранения…

– В Беларуси сейчас маски шьют не только почти все предприятия легкой промышленности, но и дизайнеры.

– Здесь такого нет. Во всяком случае, я не встречала. Но многие по собственной инициативе предлагают более пожилым людям, например, сходить в магазин, купить продукты.

– У нас еще сами себе маски шьют…

– Здесь маски не носят – это большая редкость. Единичные случаи даже в магазинах и аптеках! Но у нас их и не рекомендуют носить. Люди в Швеции стараются больше бывать на воздухе, заниматься повседневными делами, до сих пор все работают. Принято решение, что нельзя собираться больше 50 человек. На дистанционное обучение переведены университеты, но детские сады и школы работают. И директора школ отметили, что после Пасхи будут внимательно следить за тем, как дети посещают школу, потому что некоторые родители не отпускают детей на занятия из-за коронавируса. Это будет считается пропуском по неуважительной причине. Хотя надо заметить, что здесь нет никаких таких агрессивных реакций, чтобы кого-то штрафовали, наказывали. Вообще нет такого отношения к человеку, чтобы государство его ловило сачком и прихлопывало за то, что он что-то делает или не делает. Но какое-то обращение к родителям, видимо, последует.

Пока мы наблюдаем рост количества заболевших. Каждый день нам рапортуют, сколько прибавилось больных. На вчерашний день было около 14.385 тысяч подтвержденных случаев больных коронавирусом и больше 1540 смертей от болезней, связанных с этим вирусом.

– У нас тоже объявляют цифры, но белорусской официальной статистике многие не доверяют...

– Шведы верят официальной статистике. И официальные лица подчеркивают: озвученные цифры – это только то, что зафиксировано, что подтверждено. Но есть люди, которые переносят этот вирус бессимптомно или легко, некоторые не обращаются к врачам.

Большой процент больных и летальных случаев приходится на дома престарелых – как и во многих других европейских странах. Это можно объяснить: туда приходит работать наемный персонал, люди меняются, они приезжают на работу на общественном транспорте, там не хватает антисептиков. По этому поводу здесь звучит много обоснованной критики.

Проблемы есть, их много. Как ситуация будет развиваться дальше – трудно сказать.

В Швеции сделали ставку на выработку коллективного иммунитета к коронавирусу и прежде всего иммунитета самого человека. Люди гуляют на улицах, в парках, сейчас весна, солнце, многие с удовольствием проводят время на свежем воздухе. Но, как и везде, кто-то соблюдает рекомендованную дистанцию, а кто-то на эти призывы никак не реагирует. Печально, что приходится сталкиваться с таким бескультурьем в обществе, когда люди просто следуют своим собственным желаниям, не реагируя на существующие нормы и правила. Я сама часто сталкиваюсь с этими фактами и вижу в этом препятствие для остановки кризиса.

В магазинах написано «Соблюдайте дистанцию полтора-два метра», но покупатели все равно сбиваются в группы и стаи. А в Швеции невозможно сделать замечание другому человеку: мол, отойдите подальше! Это в СССР могли сказать: не смей в церковь заходить без платка и так далее. Здесь другие порядки. Это просто не принято, никто никого не учит. Нужно или обходить, или ждать, пока группа перед тобой разойдется.

В маленьких магазины, куда я хожу, есть терминалы, где ты самостоятельно можешь оплатить карточкой свои покупки, без кассира. Сканируешь цену и платишь. Но эти аппараты расположены довольно близко друг к другу, и там просто невозможно соблюдать дистанцию.

– Вместе с цифрами заболевших растет и тревожность в обществе?

– Я не сказала бы, что здесь наблюдается сильная тревожность. Пожилым рекомендовано самоизолироваться, не выходить из квартир. Но в основном люди продолжают работать, ездить в общественном транспорте…

– Есть те, кто выступает за введение жесткого карантина, как в Европе? И как вы сами относитесь к карантину?

– Европейская практика показывает, что карантин – мера действенная. Он хорошо сработал в Австрии, Чехии, Германии. Эти страны сразу ввели жесткие меры, и сейчас там ситуация уже намного лучше, они начинают постепенно возвращаться к нормальной жизни.

Возможно ли это было сделать в Швеции? Географически страна расположена так, что на севере плотность населения совсем не такая, как на юге. И климатические условия разные. В больших городах – Гетеборге, Мальмё, Стокгольме – живет много людей. Также здесь много иностранцев. Есть районы, где мигранты проживают большими семьями, и там никакие правила дистанцирования не работают – просто у людей такая культура.

Мне трудно сказать, нужно ли вводить жесткий карантин. Думаю, есть свои плюсы и минусы. И в каждом обществе по-разному относятся к этой мере.

Карантин во многом обязывает человека организовать свой внутренний мир или мир семьи совсем по-другому. Как это скажется на психике, на отношениях в семье – предсказать сложно. Должна быть проведена большая внутренняя работа.

– Сейчас в соцсетях пишут: *«Бог закрыл всем нам рты с помощью масок, потому что устал от нашей брани, лжи, наветов, осуждений. Заставил нас мыть руки и подносить ко рту хлеб чистыми руками. Приостановил молитвы в храмах, так как некоторые туда стали ходить ради галочки и показухи. Все погрязли в соцсетях, а после карантина мы будем ценить общение вживую»*. Вы согласны с этим?

– Я тоже за всем этим вижу некое предупреждение человечеству. Общество было настроено на то, чтобы развивать желание потреблять. Развивались промышленность, сервис, транспорт. А во время кризиса все это обрушилось, как карточный домик. Теперь ни рестораны не работают, ни концертные залы, ни бюро путешествий, никто сегодня не бежит в магазины за новой коллекцией одежды. Все отошло на второй план. Люди вернулись в свои дома. И многие задумались: для чего дана жизнь, правильно ли идет человечество в своем развитии, какова цель человеческого существования? И на первый план вышли совсем другие ценности. Когда человек оказался заперт в жестком карантине, ограничен в возможностях потребления самой жизнью, он вынужден обратится к чему-то другому. И если человек привык, что жизнь – это только давай, хватай, развлекайся, ему тяжело адаптироваться к новой реальности. Сейчас иначе нужно смотреть на жизнь. И многие не знают, как.

Нужно обращаться внутрь себя. Если человек и раньше духовно развивался, то для него этот карантин во благо. Потому что можно читать, смотреть – в интернете открыли много всего: лекции по истории, философии, можно учить языки, смотреть в онлайне спектакли. А некоторым хочется на улицу, в магазин. И этот внутренний конфликт у многих вызывает раздражение. Неумение сопоставить себя с ситуацией, неумение найти выход, непонимание себя самого влечет психологические кризисы.

Раньше обсуждали, нужен ли третий пол, как относиться к однополым бракам, а сейчас все ушло на второй план. Человечество вдруг ощутило себя смертным. И когда на фоне смерти возникает ощущение жизни в каждом прожитом дне… Открыл балкон, увидел солнце – и ты понимаешь: какое счастье, что я живу! Остальное – шелуха.

Меня сейчас интересует, насколько я понимаю жизнь и смерть как часть жизни. Сейчас мне кажется, многие об этом задумываются…

– Это точно!

– А еще вся эта ситуация показательна для меня в плане того, как земля отреагировала. В Венеции дельфины плавают, где-то в пригородах Парижа животные на улицах гуляют, к людям выходят. В Индии Гималаи стали видны, которых не было видно из-за смога. Вдруг природа задышала! И если человек правильно все поймет – это будет выход. Кризис кончится, промышленность возродится, но если общество снова станет бесконтрольно потреблять… Думаю, может быть апокалиптическое развитие… Материальное развитие и потребление не может и не должно перекрывать духовный рост.

Мы во многом формируем свое окружение и мир тем, как мы формируем себя лично. Жизнь – внутри меня, а с тем, что снаружи, я справлюсь! Сейчас многие должны задуматься об этих вещах. О смысле жизни. Пожалуй, это лучшее время, чтобы обратиться к душе и понять себя лично, развиваться. Внутри у каждого человека – бездна, царствие небесное.

Еще один выход – книги. Я тоскую, потому что не могу приехать на какой-то книжный развал, где есть книги на русском, и просто перебирать их. К сожалению, здесь я этого лишена… У меня есть дома библиотека, которую я собрала. Но этого недостаточно. Недавно заказала в библиотеке новую книгу Улицкой, но в последнюю минуту передумала. Откуда я могу знать, кто и сколько раз хватал эту книгу, какими руками? Книгу ведь не продезинфицируешь. Я сегодня завидую людям, которые могут купить книгу на русском, – это счастье!

Но есть интернет, я читаю новинки, пишу рецензии. Книги, искусство, фильмы – это возможность прожить дополнительную жизнь, которая тебе не дана.

– В марте вы фотографировали пустые полки в магазинах Гетеборга. Как сейчас?

– Была чудовищная паника! В больших супермаркетах расхватали муку, сахар, рис, макароны. Перед Пасхой тоже раскупили муку, сейчас нет даже дезинфекционных средств с хлоркой, которые использовались для ванной, туалета. Одно время не было стирального порошка. Но постепенно полки вновь заполнились.

– Сегодня некоторые стали бояться людей как источника опасности. Как не сойти с ума на этой почве?

– Восточная философия говорит, что кризис – это возможности. С другой стороны, это напряжение внутренних сил, выявление каких-то проблем, причем они проявляются особенно ярко, чтобы человек с этими проблемами справился.

Я не боюсь людей, но чувствую дискомфорт, когда кто-то рядом не соблюдает дистанцию и дышит мне в спину. Я лучше отойду в сторону.

Как справиться со страхом? Верить в себя. Верить в Бога.

Мы стараемся выезжать, потому что общение с природой – большое счастье. Раньше ездили в другие города, а сейчас с удовольствием ездим гулять к морю. И вроде бы оно с тобой разговаривает – сиди на берегу и слушай. И чайки кричат. И вдруг понимаешь, насколько жизнь прекрасна! Надо уметь радоваться каждому дню и каждому мгновению. Нет рядом моря – можно и лесным воздухом подышать. В этом, я считаю, и состоит прелесть человеческой жизни – ощущать гармонию и связь с природой, не противостоять ей, не подминать под себя, а получать от нее силы для своей жизни. Как люди этого не понимают?..

Марина КОКТЫШ.

ИЗ ЛИЧНОГО ДЕЛА

В результате что мы имеем на сегодняшний день? Остановлен фильм, загублены деньги налогоплательщиков, развалена моя кинокомпания, я не могу продолжать свою профессиональную деятельность. Это бардак и безобразие!

И какой у меня выход? Вот пишу в газету, обращаюсь к Президенту: «Помогите преодолеть этот чиновничий беспредел!»

Александр ЛЕВЕНЧУК, продюсер и режиссер.

ОФИЦИАЛЬНО

Минкульт готов к конструктивному сотрудничеству

«Народная Воля» попросила Министерство культуры прокомментировать ситуацию с неоконченным фильмом продюсера Александра Левенчука. Вот какое письмо, подписанное первым заместителем министра культуры ***Натальей Владимировной Карачевской****, мы получили.*

«Министерство культуры своевременно выполнило свои обязательства по договору от 12 июня 2013 года №27/17 о производстве полнометражного анимационного (с элементами игрового) фильма «Необыкновенные приключения Арбузика и Бебешки». ООО «Кинокомпания НВП», являющееся исполнителем этого социально-творческого заказа, до настоящего времени готовый фильм заказчику не предъявило. Производство фильма должно было завершиться 5 мая 2015 года, но с учетом просьбы ООО «Кинокомпания НВП» в соответствии с законодательством срок сдачи фильма был продлен до 5 июня 2015 года. Оснований для дальнейшего продления этого срока в рамках законодательства о государственных закупках за счет средств республиканского бюджета (действовавших как на момент заключения договора, так и на момент поступления просьбы о пролонгации срока производства фильма) Министерство культуры не имело. Об этом производитель фильма был неоднократно уведомлен в установленном порядке.

Финансирование производства фильма осуществлялось заказчиком в соответствии с условиями договора с октября 2013 года по апрель 2015 года (включительно), исполнителю перечислено авансовыми платежами 87 процентов стоимости производства фильма. Обязательным условием являлось предоставление в установленном порядке исполнителем отчетов о фактическом целевом использовании бюджетных средств. Названные отчеты Министерством культуры были своевременно согласованы, оснований для дополнительного авансирования кинопроекта не имелось.

Исполнителем в установленный договором срок фильм в полном объеме произведен не был. Комиссией по государственной приемке фильма 2 июня 2015 года было установлено, что работы выполнены исполнителем на 61,9 процента (при установленной условиями договора продолжительности фильма 105 минут было предъявлено фактически 65 минут). Были высказаны замечания по содержанию контента.

В сентябре 2015 года ООО «Кинокомпания НВП» дважды официально уведомила Министерство культуры о прекращении работ по завершению производства фильма, мотивируя свои действия отказом от пролонгации срока его производства. При этом законных оснований для продления срока производства фильма не имелось.

Министерство культуры предложило ООО «Кинокомпания НВП» разработать план мероприятий по выполнению условий договора социально-творческого заказа. Соответствующий план исполнителем был предоставлен заказчику, но не выполнен (21 декабря 2015 года фильм не был подготовлен к сдаче).

Позднее директором ООО «Кинокомпания НВП» А.А.Левенчуком неоднократно было заявлено, что он намерен привлечь средства партнера и после завершения производства фильма отказывается от получения оставшейся части бюджетных средств (сумма составляет 13 процентов сметы), выплата которых, согласно договору, предусмотрена после сдачи готового фильма заказчику.

Министерство культуры неоднократно предлагало А.А.Левенчуку завершить производство фильма, в установленном порядке предъявить его для приемки и подписания соответствующих документов либо вернуть заказчику исходные материалы незавершенного фильма.

Также А.А.Левенчуку неоднократно разъяснялось, что истечение срока завершения производства фильма не препятствует ООО «Кинокомпания НВП» выполнить принятые на себя договорные обязательства (договор действует до момента выполнения сторонами своих обязательств).

Возможностью подачи ходатайства об освобождении от принудительного взыскания денежных средств по результатам проверки Комитета государственного контроля (в течение года с момента вынесения решения в 2016 году) А.А.Левенчук не воспользовался.

Относительно предложения о встрече руководства Министерства культуры с руководителем итальянской компании А.А.Левенчук проинформировал об отсутствии возможности проведения такой встречи. При этом принималось во внимание, что 27 марта 2014 года суд общей юрисдикции города Рима объявил о банкротстве этой компании. Кроме того, официальный сайт, страницы в социальных сетях интернет, рецензии и оценки деятельности данного субъекта хозяйствования не выявлены.

Помимо этого, в поступившем в Министерство культуры письме руководителя упомянутой компании подтверждается использование института банкротства и сообщается о судебных разбирательствах и противоборстве в итальянских средствах массовой информации с другой крупной иностранной компанией.

Вместе с тем изложенные обстоятельства не означают, что Министерство культуры препятствует привлечению исполнителем социально-творческого заказа внебюджетных средств в рамках договора о производстве фильма, однако организация финансово-хозяйственной деятельности исполнителя не входит в обязанности органа государственного управления, являющегося заказчиком. Также Министерство культуры не может отвечать за действия подрядчиков и партнеров, которых исполнитель привлек в процессе производства фильма.

Таким образом, Министерство культуры не останавливало производство фильма, считает договор от 12 июня 2013 года №27/17 действующим и готово к конструктивному сотрудничеству с ООО «Кинокомпания НВП» в рамках законодательства. Об этом А.А.Левенчуку сообщалось неоднократно».

ПАМЯЦЬ

Дзякуй, Валодзечка, што тваё жыццё не абмінула маё…

Пяць гадоў таму не стала Уладзіміра СОДАЛЯ – самабытнага пісьменніка, выдатнага даследчыка нацыянальнай культуры і сумленнага чалавека. Ён шмат паспеў зрабіць. Працяглы час вёў на Беларускім тэлебачанні папулярную перадачу «Роднае слова». Быў актывістам Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, бараніў роднае слова дзе толькі магчыма. Напрыклад, яшчэ ў 1986 годзе арганізаваў і даслаў кіраўніку СССР Міхаілу Гарбачову калектыўны зварот «Лёс роднай мовы: трывогі і надзеі», які разам з Содалем падпісалі 28 чалавек, у тым ліку народныя пісьменнікі Беларусі Васіль Быкаў і Пімен Панчанка, народная артыстка Беларусі Стэфанія Станюта і народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў. Рэакцыя на той зварот была станоўчая – некаторыя прапановы, выказаныя беларускай інтэлігенцыяй, былі рэалізаваны... Летась выйшла ўкладзеная Міхасём Скоблам кніга Уладзіміра Содаля «Буйніцы і драбніцы», дзе поруч з творамі самога пісьменніка зьмешчаны ўспаміны пра яго. Паколькі наклад кнігі – усяго 150 асобнікаў, перадрукоўваем адтуль артыкул нашай даўняй аўтаркі Зінаіды Бандарэнка. Каб не забываць тых, хто варты ўсенароднай памяці.

Можна сказаць, мы разам прыйшлі працаваць на Беларускае тэлебачанне на пачатку 1970-х. Уладзімір Содаль – у рэдакцыю навукова-пазнавальных праграм, я – дыктарам. На той час Беларускае тэлебачанне знаходзілася ў адным з вялікіх і прыгожых будынкаў на вуліцы Камуністычнай, 6, на беразе Свіслачы. Мы ўсе настолькі самаахвярна любілі тэлебачанне, што не лічылі свае працоўныя гадзіны, мы там літаральна прападалі. І калі быў нейкі перапынак, многія выходзілі на набярэжную, абмяркоўвалі розныя сітуацыі, размаўлялі і, вядома ж, толькі пра эфір. Улічваючы, што запісаў ніякіх не было, быў толькі жывы эфір, то было шмат накладак (памылак), было шмат смешнага і сумнага. Сумнага, бо за накладкі кіраўніцтва выносіла вымовы.

Наш дыктарскі пакой знаходзіўся на першым паверсе, якраз насупраць вялікай па тым часе студыі «А». А ўсе рэдакцыі (і навукова-пазнавальная) – на чацвёртым паверсе. Праз некаторы час, пасля чарговай рэарганізацыі, усіх супрацоўнікаў гэтай рэдакцыі перасялілі на першы паверх. Памятаю, Уладзімір з калегамі жартавалі: «Нешта нас панізілі...» І нашы калектывы цяпер раздзяляў толькі пакой тэлевізійных апаратараў. А мы, дыктары, страшэнна ўзрадаваліся, таму што для многіх з нас была знята праблема беларускага вымаўлення. Усе «навукоўцы», як мы называлі супрацоўнікаў гэтай рэдакцыі, мову ведалі бездакорна. Пра Уладзіміра і казаць не трэба.



Сяброўства і павага паміж нашымі калектывамі без перабольшання былі велізарныя. Мы бясконца забягалі ў суседні пакой са сваімі пытаннямі, а яны да нас – на гарбату. Валодзя заўсёды здзіўляў нас сваёй сціпласцю, інтэлігентнасцю, дабрынёй. Я асабліва адчувала роднасць нашых душ і яго сяброўскае апякунства. Пасля кожнай чарговай маёй камандзіроўкі ў Маскву на жывы эфір ці за мяжу на Дні культуры Беларусі памятаю яго заўсёднае пытанне: «Як з’ездзіла?» І дадаваў: «Бачылі, бачылі. Добра. Віншую!»

Значна пазней я даведалася, што Уладзіміравы продкі (ці не прадзед) служылі ў атачэнні князя Паскевіча на Гомельшчыне. А мае дзядулі, прабабкі і бацькі – родам з Гомельскага Палесся. Вось і былі ў нас агульныя родныя карані.

Спачатку я не асмельвалася дапытвацца, што ў Валодзі з вокам, тым больш не так было гэта заўважна. Думала, што гэта ад нараджэння, і сваім пытаннем баялася траўмаваць маладога чалавека. А ён аднойчы, зайшоўшы ў дыктарскую, распавёў нам сам пра сваё дзяцінства, пра тое, што здарылася з малымі, калі гулялі з гранатай, якую знайшлі ў лесе… У мяне зашчымела сэрца. Я ўспомніла і расказала пра свае дзіцячыя пасляваенныя гульні: калі мы з матуляй і братам вярнуліся пасля блакады з лесу ў вёску, мне было 4 гадочкі, брату Ігару – 12. Седзячы з мамай у зямлянцы, бо хаты ўсе былі спалены, мы пачулі страшэнны выбух. Мама з крыкам «Ігар!» выбегла наверх, пабегла. А праз некаторы час вазок ужо вёз тое, што засталося ад чатырох хлопчыкаў, а мама, шчаслівая і ў слязах, вяла Ігара за руку – ён быў на другім баку вёскі. Пра ўсё гэта мы тады ў дыктарскай гаварылі, кожны ўспамінаў сваю гісторыю.

Праз некаторы час Уладзімір стаў аўтарам і вядоўцам праграмы «Роднае слова». Ён і не ведаў, які вялікі ўплыў мела ягоная перадача на ўсіх нас. Ён вёў праграму ў вышыванцы і з такой любоўю і ласкавасцю гаварыў пра Беларусь і беларусаў! Вельмі часта яго госці пасля эфіру заходзілі да нас у дыктарскую, і гутаркі працягваліся. Божа, куды падзелася тое цікавае незабыўнае жыццё?.. Яно было такім, дзякуючы Уладзіміру. Дабрыня і сардэчнасць – гэта тое, чаго не хапае цяпер Беларускаму тэлебачанню.

Дзякуючы менавіта Уладзіміру Содалю, я адчула, што павінна часцей выходзіць у эфір, асабліва ў святочныя дні, у вышыванцы. І асабліва калі прадстаўляю Беларусь у Маскве, за мяжой. Добра, што ў нас былі прыхільныя стасункі з Рэспубліканскім цэнтрам моды. А ў той час мы, дыктары, маладыя, худзенькія, і на нашы постаці добра падыходзілі строі беларускіх манекеншчыц. Нам і давалі іх ласкава на патрэбны час.

Прайшло шмат гадоў. Мы ўжо не працавалі на тэлебачанні. Сустракаліся на мітынгах, на пасяджэннях Рады інтэлігенцыі ці ў Таварыстве беларускай мовы. Аднойчы пры сустрэчы Уладзімір з болем сказаў: «Што робіцца на нашым экране? Дзе беларускае слова? Куды знікла дабрыня? Голая прапаганда. Пустыя вядоўцы. А мы ж калісь былі асветнікамі. Баліць душа за Беларусь!»

Так, у яго заўсёды балела душа за тое, што не шануем сваё мінулае, сваю гісторыю, сваіх знакамітых людзей. Аднойчы, даведаўшыся, што маё лецішча знаходзіцца непадалёку ад Астрашыцкага Гарадка, з болем распавёў: «А ты ведаеш, што там недалёка вёска Карпілаўка, дзе на пачатку 1920-х Янка Купала арандаваў зямлю, ён там жыў, шмат пісаў, прымаў малых дзетак, там такія мясціны... Ну чаму б не ўшанаваць памяць народнага паэта шыльдай, стварыць там музей?»

Аднойчы ў галерэі «Ў» Уладзімір убачыў мяне ў вышыванцы. Адразу: «Я напішу нарыс пра тваю вышыванку і пра цябе». Гэта былі апошнія, цяжкія для яго, гады жыцця. Потым патэлефанаваў, паскардзіўся: «Напісаў, але нешта не друкуюць». – «Валодзя, не турбуйся!»

Божа, такі быў шчаслівы, калі надрукавалі!

У апошнія месяцы жыцця ён усё ж завітаў на пасяджэнне Рады інтэлігенцыі. Было бачна, што яму цяжка. Па заканчэнні мы з Уладзімірам Коласам вырашылі адвезці яго на машыне. Адмаўляўся: «Мне недалёка, я дайду». Ледзьве пераканалі.

А яго любоў і гонар за сям’ю! Колькі цеплыні было ў размовах пра жонку Клару, дзяцей Аксану і Марата, пра ўнукаў. «Мой Сержык піша вершы, хутка будзе выдадзена кніжачка».

Чалавек пакідае пасля сябе дзяцей, сяброў і ўсе добрыя справы, якія ён зрабіў за жыццё. За гэта яго будуць памятаць і ўшаноўваць тыя, хто яго ведаў, хто любіў і хто будзе карыстацца плёнам яго працы.

Дзякуй, Валодзечка, што тваё жыццё не абмінула маё і што я змагла скарыстаць твае парады і твой творчы вопыт і не хаваць сваёй любасці да Беларусі!

Зінаіда БАНДАРЭНКА, народная артыстка Беларусі.

АСОБА

Сцяпан СОКАЛ:
«Мне двойчы прапаноўвалі міністэрскія пасады»



*Відно сокала па палёце – гаворыць народная мудрасць. Наўрад ці **Сцяпан Сокал** у жыцці свядома кіраваўся гэтым мудраслоўем, жывучы найперш уласным розумам. Але трыццаць гадоў таму ён смела выправіўся ў свой «палёт», стварыўшы першую ў Беларусі прыватную вышэйшую навучальную ўстанову – Беларускі інстытут правазнаўства. Даўшы адукацыю тысячам юрыстаў у самых розных сферах, ён паспяхова дзейнічае і сёння. Якія перспектывы ў нашай краіне мае недзяржаўная адукацыя? Чаму можа навучыць пандэмія беларускія ВНУ? Кім з выпускнікоў ганарыцца прэстыжны БІП?*

Каб атрымаць адказы на гэтыя і іншыя пытанні, я выправіўся ў госці да яго стваральніка.

– Сцяпан Фёдаравіч, яшчэ існаваў Савецкі Саюз, яшчэ кіравала партыя, што была «розумам, гонарам і сумленнем эпохі». Як вы ў 1990 годзе адважыліся стварыць уласны інстытут?

– У той час я быў абраны старшынёй Саюза юрыстаў. А ўжо былі дазволены малыя прадпрыемствы, пачаўся дробны бізнес, і значна ўзрасла патрэба ў юрыстах. І вось пры саюзе мы і стварылі наш інстытут, які спачатку называўся Мінскай вышэйшай юрыдычнай школай, куды па першым часе набіралі толькі асоб, якія ўжо мелі вышэйшую неюрыдычную адукацыю. Адносна нашай школы была нават прынята адмысловая пастанова Савета міністраў БССР. Першапачаткова рыхтавалі толькі юрыстаў, паступова ўвялі новыя спецыялізацыі, якіх раней не існавала: падатковае і фінансавае права, прававое забеспячэнне знешнеэканамічнай дзейнасці. На сёння ў нас дзевяць спецыяльнасцяў, у тым ліку ў сферы інфармацыйных тэхналогій.

– За трыццаць гадоў колькі чалавек скончылі БІП?

– Больш за 30.000. На сённяшні дзень у нас амаль 5000 студэнтаў. У лепшыя часы даходзіла да 10.000, калі лічыць разам з двума філіяламі – гродзенскім і магілёўскім (быў яшчэ і баранавіцкі, ён увайшоў у мясцовы дзяржаўны ўніверсітэт).

– Працуеце вы з размахам. А дзе працаўладкоўваюцца вашы выпускнікі?

– І ў Беларусі, і за мяжой – у ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Швейцарыі. У нас жа ёсць спецыяльнасць «Міжнароднае права». Многія нашы выпускнікі забяспечваюць інтарэсы сумесных прадпрыемстваў. Асабіста я падпісаў, можа, з паўтысячы рэкамендацый для замежных фірмаў.

– А кім са сваіх выпускнікоў вы асабліва ганарыцеся?

– Такіх шмат. Напрыклад, дыплом аб заканчэнні БІПа маюць адзін з віцэ-прэм'ераў урада, першы намеснік старшыні Следчага камітэта, намеснік Мытнага камітэта. У пэўны час атрымалася так, што ў пракуратуры Магілёўскай вобласці працавала працэнтаў 60 нашых кадраў, а ў судовай сістэме – працэнтаў 40.

– Чаму вы сышлі з пасады рэктара?

– Гады бяруць сваё – мне сёлета будзе ўжо 78. Таму было вырашана наняць рэктара збоку. Я лічуся дарадчыкам, але за мной засталіся кадры і фінансы.

– Вы вырашаеце, скажам, камусьці выплаціць прэміі…

– А рэктар падпісвае адпаведны загад (*усміхаецца*). Зняўшы з сябе рэктарскія абавязкі, я маю час на ажыццяўленне самых розных праектаў. Напрыклад, летась я стварыў Фонд падтрымкі прававой навукі і адукацыі. Мы ўзнагароджваем лепшых студэнтаў і выкладчыкаў, прычым не толькі ў БІПе, але і ў нашых каледжах у Мінску, Гродне, Брэсце, Магілёве і Салігорску.

– Хто ў БІПе гаспадар, відно ў фае адміністрацыйнага будынка. Там на сцяне – ваш вялікі партрэт.

– Той партрэт мне падарылі на 75-годдзе. Навошта ён мне дома? Хтосьці з супрацоўнікаў пастараўся – а іх у нас 351 чалавек (адміністрацыя, выкладчыкі, дапаможны персанал). Хоць, прызнацца, я не люблю, калі мяне хваляць публічна, шчыра вам кажу. Не люблю ліслівасці. Але, з другога боку, трэба, каб аўтарытэт падтрымліваўся.

– Ад таго партрэта культам асобы папахвае.

– Ніякім культам у нас не пахне. Але стваральніка ў любой справе трэба памятаць. Ведаеце, ёсць такія вагоны – пульманы? Дык іх Пульман прыдумаў. Так і тут. На гэтую тэму анекдот раскажу. Прыйшоў селянін у краму «Культтавары» і пытаецца, ці можна лейцы набыць. Прадавачка пытаецца: «А что это?» – «Ну, па-руску кажучы, «важжы». Яна і прыносіць партрэты членаў Палітбюро. Селянін пачухаў патыліцу: «Не, я шукаю такія «важжы», якімі кіраваць можна, а гэтых жа вешаць трэба!»

– Стварыўшы паспяховую прыватную ВНУ, як вы ацэньваеце перспектывы недзяржаўнай адукацыі ў Беларусі? Здаецца, міністр Ігар Карпенка не вельмі яе шануе.

– А між тым яго сын скончыў наш інстытут. Карпенка адкрыта не выступае супраць недзяржаўнай адукацыі, але вось вам толькі адзін факт: раней у нас было 18 прыватных ВНУ, а сёння засталіся практычна толькі дзве – Міжнародны інстытут працоўных сацыяльных адносін і наш. Ну яшчэ хіба Інстытут сучасных ведаў. Праблем у нас хапае. Вазьміце тыя ж памяшканні. Мы пры БІПе неяк стварылі гімназію, для якой арандавалі зачынены дзіцячы садок на вуліцы Лесі Украінкі. Нармальна дзейнічала тая гімназія гадоў пяць. А потым дзяржава нас з таго садка выгнала і перадала будынак нейкім фізкультурнікам. Мы дамовіліся з прафсаюзамі і перабраліся на іх базу ў Ждановічах. Праўда, пасля пярэбараў колькасць гімназістаў скарацілася ўдвая. А пасля і прафсаюзы нас выгналі, давялося нам зачыніць гімназію.

– Не знайшлі памяшкання?

– Патрэбнага не знайшлі. Самае цікавае, што гады два таму трапілася мне на вочы аб'ява: прадаецца дзіцячы садок на Лесі Украінкі. Той самы. Пайшлі мы з сынам паглядзець – жах! Страхі амаль няма, усё памяшканне заліта вадой – хоць на каньках па першым паверсе катайся. І гэта не адзіны такі выпадак, калі дзяржава нейкую справу лепш зусім занядбае, чым аддасць прыватніку.

– А ці адрозніваецца навучальная праграма ў вас і ў дзяржаўных ВНУ?

– Спачатку адрознівалася, мы самі вырашалі, якія прадметы вывучаем, колькі гадзін на іх адвесці. А потым чыноўнікі нас абавязалі выконваць дзяржаўныя навучальныя планы. Туды не лезьце, гэта нельга… Давялі да таго, што цяпер на юрфаку БДУ і ў нас – адна і тая ж праграма.

– Бачу на вашым працоўным стале Статут Вялікага Княства Літоўскага, выдадзены «Беларускай энцыклапедыяй» у 1989 годзе. Перачытваеце?

– Такую кнігу варта заўсёды трымаць пад рукой. Я ганаруся, што быў адным з ініцыятараў яе перавыдання, аўтарам даведачных артыкулаў і членам рэдкалегіі. Гэта мы з маім настаўнікам Язэпам Юхо прапанавалі перавыдаць Статут, выдавецтва пагадзілася, і ён выйшаў накладам 10.000 асобнікаў, хапіла ўсім юрыстам.

– Там цудоўная старабеларуская мова, але вельмі часта сустракаецца выраз «горлам мае быць караны» (так абазначалася смяротнае пакаранне).

– Колькі трэба, столькі і сустракаецца. Статут – вяршыня прававой думкі на той час. Узровень праватворчасці і правапрымянення ў Беларусі ў XVI – пачатку XVII стагоддзя быў вышэйшы, чым ва ўсёй Еўропе. Нездарма нашым Статутам карысталіся і ў замежжы. Гэта своеасаблівы экспарт прававога матэрыялу з беларускіх земляў у другія краіны. Вось я мару стварыць музей права, дзе будзе паказана, як дзейнічала тут судовая сістэма. Што да смяротных пакаранняў, то і яны абумоўлены тым, зусім не гуманным, часам. Цялесныя пашкоджанні кваліфікаваліся як прычыненне шкоды камусьці. На той час, я лічу, і прыгоннае права было з'явай прагрэсіўнай. Людзі рассяляліся і часта рабіліся аб'ектам рабавання. Уявіце сітуацыю: едзе безабаронны чалавек, а насустрач рабаўнікі. І тады сталі дамаўляцца: я буду пры табе, але ты ж мяне абарані. І гэта было нармальна.

– Беларусь – адзіная краіна ў Еўропе, дзе застаецца смяротнае пакаранне. Вы за яго ці супраць?

– Дзесьці 50 на 50. З аднаго боку, чалавечае жыццё – бясцэннае. З другога – бываюць выпадкі, калі неабходна прымяняць вышэйшую меру. Справа ў тым, што ў нас пакуль не адладжана сістэма нармальнага пажыццёвага пакарання. Помніце нарвежца Брэйвіка, які расстраляў больш за 70 чалавек? Ён прыгавораны да пажыццёвай няволі, сядзіць у камфортнай нарвежскай турме. Настолькі камфортнай, што заказвае сабе ежу, піша скаргі на адміністрацыю. Калі і ў нас будзе такое пажыццёвае пакаранне, то лепш ужо вышэйшая мера.

– Прысутнічае ў вашым кабінеце і скульптурная выява Феміды, хоць павязка на яе вачах можа ўспрымацца хіба з іроніяй. Бо і насамрэч: пра якую незалежнасць судовай сістэмы можна гаварыць, калі судзі прызначаюцца выканаўчай уладай?

– Тут я з вамі згодны, гэта ненармальная сітуацыя. Я за тое, каб заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлады былі сапраўды незалежнымі. Нават у ВКЛ копныя суды выбіраліся, нават у Савецкім Саюзе суддзі раённага ўзроўню выбіраліся, а не прызначаліся. І сёння, я лічу, павінны выбірацца. Іншая справа – кім? Або наўпрост народам, або раённымі Саветамі дэпутатаў.

– Як выявілася падчас пандэміі, у нашых ВНУ не адладжана сістэма дыстанцыйнага навучання. Як з гэтым у БІПе?

– У нас усё адладжана. Дарэчы, я даўно выступаю супраць сістэмы навучання, створанай нават не ў СССР, а яшчэ ў царскай Расіі. У той сістэме лекцыі – асноўны спосаб інфармавання студэнтаў. Але ж гэта пазаўчарашні дзень! У БІПе на грамадзянскае права адведзена прыкладна 340 гадзін, з іх 180 – лекцыі. Слухайце, навошта сучаснаму студэнту сядзець на тых лекцыях, калі тую ж інфармацыю можна атрымаць, не выходзячы з хаты? Я спадзяюся, што каранавірус падштурхне нашу сістэму адукацыі, каб яна хутчэй засвойвала новыя формы навучання, у тым ліку праз інтэрнэт. У нас і да каранавіруса па кожным прадмеце была пэўная колькасць лекцый, якая чыталася дыстанцыйна. А цяпер іх стала яшчэ больш, мы не маем права рызыкаваць здароўем і жыццём людзей.

– На жаль, улада наша не супраць і парызыкаваць. Да гэтай пары працягваюцца рэпетыцыі ваеннага парада на Дзень Перамогі.

– Навошта ён? Мой бацька – інвалід вайны, я сам – дзіця вайны. Добра памятаю, як у 1965 годзе ўпершыню адзначалі 9 Мая як свята, я тады студэнтам быў. Да гэтага і Сталін не дадумаўся! Каму патрэбны гэтыя дэманстрацыі пад лозунгамі «Мы перамаглі!». Тут няма чым хваліцца, паколькі пераможаныя немцы жывуць значна лепш за пераможцаў. Я лічу, што парад і дэманстрацыі ў гэты дзень трэба ўвогуле адмяніць. Маёй унучцы – гэта ўжо трэцяе паваеннае пакаленне – нейкі ідэолаг будзе расказваць пра нязломны дух савецкага народа… 9 Мая адзначаць трэба, але па-іншаму.

– Адкуль у вас, вясковага хлопца з Ляхавіцкага раёна, прадпрымальніцка-гаспадарская жылка?

– Ад маіх дзядоў, якія мелі сваю зямлю, гаспадарылі на ёй. Як казаў пан Быкоўскі, я дробны, але шляхціц (*смяецца*). А яшчэ ад заняткаў музыкай – я ж перад юрфакам БДУ скончыў музычнае вучылішча і паспеў папрацаваць выкладчыкам музыкі. А каб добра зайграць паланез Агінскага ці фугу Баха, трэба іх сто разоў паўтарыць. Вось і выпрацоўваецца характар у дасягненні мэты. А яшчэ я са школьных гадоў цікавіўся роднай гісторыяй, ведаў пра Беларускую Народную Рэспубліку, пра бел-чырвона-белы сцяг.

– Ведаў у вясковай школе ў 1950-я гады? Вы жартуеце?

– Я тады жыў у сям'і свайго дзядзькі ў Баранавічах і вучыўся ў школе, якая была беларускай не толькі на паперы. У школе ўсе размаўлялі па-беларуску. І я не магу сказаць, што гэта свядома ўсталёўвалася з боку адміністрацыі. Мова натуральна прысутнічала ў нашым жыцці. Помню, у сёмым класе я сядзеў за партай з хлопчыкам, прозвішча якога было Верабей. На суседняй лаўцы сядзеў Дрозд. Ну і я – Сокал. Мы асабліва цікавіліся рознымі гістарычнымі падзеямі. І неяк хтосьці з сяброў мне сказаў: «А ты ведаеш, які наш нацыянальны сцяг? Бел-чырвона-белы».

– Ну вы ж не абмяркоўвалі гэта з настаўнікам гісторыі.

– Той настаўнік ведаў пра гісторыю менш, чым я. Бо мая цётка вучылася пры немцах у мастацкай школе, і ў яе захавалася розная літаратура, у тым ліку пра гістарычны шлях Беларусі і г.д. Былі і кнігі, выдадзеныя ў міжваеннай Вільні ў 1930-я гады. Там я якраз і прачытаў пра БНР. Я аднойчы спытаўся ў цёткі, адкуль у яе ўсё гэта. Яна патлумачыла, але папрасіла нікому не расказваць.

– Вы былі двойчы жанаты, у вас трое дзяцей і пяцёра ўнукаў. Чаму так сталася, што жывяце адзін?

– Я ўжо прызвычаіўся да самотнага жыцця. У мяне столькі розных зацікаўленняў, што я яго не заўважаю. Да таго ж я сябе яшчэ і нармальным мужыком адчуваю, на жанчын неабыякава гляджу... З першай жонкай мы захавалі добрыя адносіны, 37 гадоў разам пражылі, двое дзяцей у нас. А малодшай дачцэ ад другога шлюбу толькі 15 пакуль, падлетак яшчэ.

– Сёлета Вялікдзень мы адзначалі ва ўмовах пандэміі, шмат у чым сябе абмяжоўваючы. А як святкавалі гэты дзень на вашай малой радзіме?

– Традыцыйна – яйкі фарбавалі, валачобнікі хадзілі. Помню, мы са старэйшай дачкой прыехалі ў мае Шавялі на Ляхавіччыне недзе на пачатку 1970-х. І захацелася ёй павалачобнічаць. А тады яшчэ шмат сваякоў нашых там жыло. Прайшлі чатыры-пяць хат – дык і панесці ўжо не можам усяго, што нам надавалі. Дачка пабегла да дзеда: «Запрагай каня, паедзем валачобнае збіраць» (*смяецца*). У нас усе даўнія святы адзначаліся. На Каляды таксама па хатах хадзілі, я паперадзе зорку насіў. Дзед мяне ў царкву вадзіў, дзе вельмі прыгожа спяваў хор пеўчых. Я ведаў усе біблейскія прыпавесці – яшчэ да школы. Нават пэўны час хацеў святаром стаць.

– Не шкадуеце, што іншую прафесію выбралі?

– Не шкадую, я сваёй прафесіяй задаволены. Асабліва задаволены, што стварыў Беларускі інстытут правазнаўства. Мне двойчы прапаноўвалі міністэрскія пасады – і міністра юстыцыі, і міністра адукацыі. Я адмовіўся. Помніце, ёсць такі літоўскі фільм «Ніхто не хацеў паміраць». Там саветы злавілі аднаго з «лясных братоў» і дапытваюць: «Ты з кім – з прыхільнікамі незалежнай Літвы ці з намі, хто за Літву савецкую?» А ён адказвае: «Я са сваёй бабай». Так і я – найперш са сваім інстытутам. Мне яго ніякія высокія пасады не заменяць.

Міхась СКОБЛА.

СОЛИДАРНОСТЬ


«Страдают от насилия со стороны взрослых сыновей и дочерей…»

Компания А1 поддержала инициативу Фонда ООН в области народонаселения (ЮНФПА) сделать звонки на общенациональную горячую линию для пострадавших от домашнего насилия бесплатными для своих абонентов. Горячая линия работает на базе международного общественного объединения «Гендерные перспективы».

Теперь в случае необходимости люди, столкнувшиеся с проявлениями физического, психологического, сексуального либо экономического насилия в семье, могут бесплатно звонить по телефону общенациональной горячей линии для пострадавших от домашнего насилия **8-801-100-8-801** не только с городского номера, но и с любого абонентского номера А1. Таким образом, у тех, кто оказался в сложной жизненной ситуации, появится больше возможностей получить своевременную помощь – социальную, психологическую и юридическую.

«Звонок на горячую линию для человека, столкнувшегося с насилием, – это первый шаг на пути получения поддержки, помощи и решения проблемы, – отметила **Ольга Атрощенко**, глава офиса ЮНФПА в Беларуси. – *Часто у пострадавших возникает ощущение беспомощности и безвыходности. Поэтому важно знать, с чего начать, где искать помощь и куда можно обратиться в поисках поддержки и профессионального совета. Примерно 34 процента клиентов линии – люди старшего возраста, которые чаще всего страдают от насилия со стороны взрослых сыновей и дочерей. А сегодня это насилие усиливается наряду с проблемами психического свойства, поскольку семьи испытывают беспокойство, экономический стресс, проводя гораздо больше времени дома, в замкнутом пространстве».*

Общенациональная горячая линия для пострадавших от домашнего насилия была открыта 13 августа 2012 года на базе международной общественной организации «Гендерные перспективы». Телефонные звонки принимаются ежедневно с 8.00 до 20.00. По вторникам и субботам на линии дежурит юрист, в остальные дни – психолог.



Коллаж Ирины ПУСТОВАЛОВОЙ.

В ТЕМУ

Как эпидемия влияет на домашнее насилие?

По всему миру фиксируется рост домашнего насилия: на 20%–50% (Франция, США, Дания), в два-три раза в Китае, Индии, России.

Почему насилия становится больше?

Тревога, неопределенность, страх потерять работу. Необходимость находиться круглосуточно вместе с запертом пространстве в условиях карантина. Вспышку агрессии может вызвать любая мелочь.

Почему во время эпидемии сложнее получить помощь?

Агрессор всегда рядом: позвонить по телефону сложнее. Полиция и медики перегружены работой, убежища закрываются на карантин, бежать некуда.

Как страны пытаются решить проблему?

Опустевшие отели отдают под убежища.

Оборудуют тревожные кнопки в аптеках и магазинах.

Создают приложения для полиции и горячих линий – жертвы насилия могут не позвонить, а написать.

Пострадавших не штрафуют за нарушение карантина.

Что происходит в Беларуси?

Всплеск насилия пока не зарегистрирован, потому что официально карантин не объявлен.

Что делать, если вы находитесь в опасности?

Соберите «тревожный чемоданчик» (деньги, документы), лучше его хранить вне дома в тайном месте.

Договоритесь о проживании у родственников либо в убежище.

Уходите, когда насильника нет дома.

Галина РУТ.

ОЧЕНЬ ЛИЧНОЕ

МАМИНЫ ГЛАЗА

Мы любим сестру,
и жену, и отца,
Но в муках мы
мать вспоминаем.
Николай Некрасов

…Я лежу на больничной койке. Завтра мне предстоит операция. После долговременного пребывания в чернобыльской зоне в качестве ликвидатора последствий аварии на атомной электростанции у меня вдруг резко стало падать зрение. Вот уже на расстоянии пяти сантиметров я не могу сосчитать на руке пальцы. Так, болтается что-то в густом тумане вроде силуэта спецовочной рукавицы…

Консилиум врачей накануне моего «судного дня» вынес суровый, не подлежащий опротестованию вердикт: «Удаление катаракты с заменой хрусталика левого глаза».

В запасе у меня почти целые сутки. Запрограммированный режимом дня послеобеденный сон никак не получается. Томление неизвестностью действует на психику угнетающе и, чего греха таить, весьма устрашающе: как там дело-то обернется? Не палец ведь, а глаз все-таки!

Профессиональный авторитет врачей сомнений вроде не вызывает, но коварный червячок сомнения в подсознании все же нагловато ворочается, покоя не дает. В который раз, глядя правым, пока еще, слава Богу, относительно здоровым глазом в пожелтевший от времени потолок больничной палаты, вспоминаю свою маму. Она даже во сне стала приходить именно тогда, когда мне трудно. Но чаще всего я вижу ее глаза, особенно такие, какими они были в последние годы ее жизни.

Милая, добрая, славная моя мама! Самое светлое, самое искреннее и заветное связано у меня с твоим немеркнущим святым образом. Первые сшитые твоими руками рубашечки и штанишки. Первые выведенные с твоей помощью буковки в ученической тетрадке. Первые успехи и досадные огорчения в школе. Застывшие бисеринки слез на твоих ресницах в день моих проводов на армейскую службу. Радостное ликование глаз от приятной новости: младшенький сынок поступил в университет, да еще на факультет журналистики!

Честно признаться, еще три года назад в сельской школе, где я был одним из лучших знатоков языка и литературы, я и помыслить бы не дерзнул о таком удачном повороте судьбы. Это Господь Бог, да армейская служба в ракетных войсках, да собственное усердие перевернули все мои прежние желания, помогли выбрать ту единственную и любимую мною дорогу, которую исподволь ненавязчиво, но уверенно мостила для меня ты, моя умница, моя незабвенная и прозорливая мама.



Коллаж Ирины ПУСТОВАЛОВОЙ.

Своим природным дарованием, спартанским воспитанием, добропорядочностью, личным примером, бескорыстным самопожертвованием во имя счастья детей.

Сколько помню себя, мы с мамой были одинаковыми оптимистами, фантазерами, какими-то одержимыми и шухарными заговорщиками, понимающими друг друга не только с полуслова, полужеста, но и с полувзгляда. Все, что она думала, я научился с годами отчетливо и безошибочно читать в ее проникновенных глазах. Разговаривает она, к примеру, со сплетницей-соседкой. Вроде все на полном серьезе, а сама уголком глаза в мою сторону косит. И я понимаю: не верит она этой лисице, насмехается в душе над ее жалкими потугами очернить кого-то, осуждает эту завистницу за ее козни.

Уйдет соседушка, а я, зафиксировав недавнее выражение маминых глаз, безошибочно расшифровываю вслух ее отношение к состоявшемуся только что диалогу. Дружба с мамой была у меня необыкновенно доверительной, крепкой.

До сих пор поражаюсь загадочному дару матери видеть буквально всех насквозь. Ей абсолютно невозможно было солгать – ни в большом, ни в малом. В ее всевидящих глазах пряталось какое-то еще одно, очевидно, внутреннее зрение. Вот я приезжаю из города на выходные дни или на каникулы, в отпуск. Веселый, беззаботный. Рассказываю долго и много о своих делах, об успехах дочери, сыплю прибаутками, мелю всякие были и небылицы. Самому мне кажется, что я абсолютно искренен, бесшабашен, всем доволен и все мои уловки должны непременно затмить, замаскировать то, чего мама не должна знать. А она вдруг глянет на меня с неуловимым подозрением и осторожненько так, чтобы не ранить невзначай родную душу, но без обиняков заметит:

– Мне кажется, сынок, что в семье у тебя не все в порядке. Уж не поругался ли ты часом со своей Валей?

Как часто и с какой неутихающей болью звучат в моей изболевшейся душе жестокие в своей справедливости слова песни: «Всё на свете могут наши мамы, только не умеют не стареть». Боже мой, до чего же тонко подмечено! За суматохой быстротечных будней, за личными, семейными да служебными делами мы как-то совсем не заметили, нет, мы просто не могли себе представить, что наша всегда и всё успевающая труженица и неисправимая оптимистка мама когда-то может состариться, сбавить обороты, слечь в постель…

Приезжая на лето в родительский дом, мы, трое сыновей, вечно были в каких-то делах, все куда-то спешили. То сено заготавливали, то дрова в лесу, то заборы да сараи чинили, то на грядках что-то сажали, пололи да убирали. Заскочишь, бывало, на секундочку в хату по какой-нибудь неотложной надобности, а мама, словно только этого и ждала, просит: «Присядь, Мишка, отдохни, поговори со мной».

Иногда обидно до слез и до злости: там работа не терпит отлагательства, а она, видите ли, тарыбары затеять норовит.

Господи, помилуй меня, грешного, непонятливого и непочтительного сына! Я ведь любил и люблю свою ушедшую в мир иной маму больше всех на свете. А посидеть с ней пару лишних минут считал тогда непозволительной роскошью. Посидел бы теперь, да не с кем…

Еще более щемящие воспоминания связаны с зимними посещениями родительского дома. Наведываться туда приходилось подчас на совсем непродолжительное время. В городе – своя семья, на два этих долгожданных выходных дня тоже планируются какие-то лично-семейные дела: то дочь в театр или цирк сводить надо, то в гости к друзьям, родственникам обещаем прийти целую вечность, да еще обстоятельства не пускают. Но поездка к родителям, несмотря ни на что, всегда была делом святым, обязательным. Свежих продуктов старичкам подвезти или просто проведать, поговорить, обменяться новостями. Бывало, в пятницу после работы последним рейсом автобуса примчишься, расспросишь обо всем, больные косточки обоим натрешь скипидаром, горчичнички или банки поставишь, полы перетрешь, а назавтра в одиннадцать утра снова в город уезжать – такое вот было расписание автобуса. Обиды в голосе мамы не слышал никогда, а вот застывшая в глазах печаль до сих пор покоя не дает. Хотя прекрасно понимаю: повторись все сначала – ничего изменить не смог бы, потому что проклятые жизненные обстоятельства всегда почему-то оказывается выше нас…

Видимо, в последние годы жизни и маму нашу мучила давнишняя моя беда – катаракта. Когда мы спрашивали ее о самочувствии, она, как и все пожилые люди, охотно рассказывала о своих недомоганиях и болячках: и ноги-то у нее перестали слушаться, и аппетита никакого, и сердечко пошаливает. Но больше всего сокрушалась по поводу зрения: совсем, дескать, глаза перестали видеть, все вокруг туманом окутано.

Мы и сами стали замечать с некоторых пор, что ее такие живые, выразительные и обычно веселые небесные глаза с годами как-то выцвели, неестественно потускнели. Пропала невесть куда озорная искорка, а зрачки превратились в индифферентные ко всему капельки серого вещества.

Это я потом, сам пережив дважды подобную катастрофу, все вдруг явственно понял, душевно прозрел и содрогнулся, по-настоящему ощутив меру ее терпения, житейской мудрости. Она, бедняжка, пожаловаться нам хотела, найти сочувствие, а то и помощь, а мы, любимые, но такие невнимательные отпрыски, с непонятным хладнокровием плели ей в ответ нечто несуразное:

– Чего ж вы хотите, мама? Чтобы в ваши восемьдесят с лишним лет видеть так, как в восемнадцать? Мы ведь дети ваши, а уже все очки носим. Лечить зрение пока никто еще не научился.

Да, по тем временам так и было.

Ах, какими жестокими и немилосердными бываем мы порой по отношению к своим родителям! Как поздно начинаем смотреть на окружающий мир их мудрыми, справедливыми и терпеливыми глазами! Потом эти азбучные истины в конце концов все-таки доходят до нас, но, как говорится, укусить себя за локоть еще никому не удавалось.

…Умирала наша мама тихо, без особых жалоб, причитаний и стонов. Дышала прерывисто, часто, все больше как-то от себя. Я сидел у ее изголовья и лил запоздалые слезы, точно зная, что ничем уже не в силах облегчить ее страдания. Невмоготу было, но не мог отвести свой виноватый взор от ее угасающих, потерявших всякую жизненную силу глаз. Ни укора в них, ни мольбы, ни осуждения. Это был первый в моей жизни случай, когда вот так наяву, рядышком уходило, ускользало, навечно уплывало в небытие человеческое естество, да не чье-то чужое, а самое драгоценное, мамино. Как тяжело было смириться с тем, что такой вот до боли знакомый человек прощается с жизнью, а помочь ему ты уже ну никак не в состоянии!

Время от времени я спрашивал маму, чего бы ей хотелось, и она неизменно тихо, сдержанно, будто виновато, отвечала: «Водички. Простой холодненькой водички… Из колодца».

Глаза ее чуточку приоткрывались, она пыталась улыбнуться мне в знак признательности и благодарности, но уже не могла. Я отчетливо понимал, что ниточка, соединяющая ее с этим миром, вот-вот оборвется, милые, добрые, самые умные и самые преданные на свете глаза угаснут и увидеть мне их посчастливится разве что в неожиданном приятном сне…

Прошли годы. Многое за это время передумалось, переосмыслилось, переоценилось. Дважды на собственном жизненном примере пришлось убедиться, как дорого стоит самая привычная способность человеческого организма – зрение. У меня, слава Всепышнему, первая, а через три года и вторая – уже на правом глазу – операции завершились благополучно. Спасибо прогрессу в медицинской науке, а также золотым рукам и неравнодушному сердцу великого мастера своего дела Татьяны Александровны Имшенецкой! Это она подняла из руин и пепла мое выжженное чернобыльским «мирным атомом» зрение, вернула меня к любимой работе, семье, друзьям, знакомым, подарила счастье видеть земной мир. Не зря ведь на сегодняшний день она уже профессор-офтальмолог. А ведь еще не так давно, когда не было такой могучей медицины, не обойтись мне без поводыря…

И все-таки на белый этот свет после двух потрясений я стал глядеть совсем по-иному. Я вижу все окружающее как будто не собственным взором, а глазами матери. Мудрой. Понятливой. Юморной. Пророческой. Справедливой. Честной. Неподкупной. Бескомпромиссной…

Где еще найти мне море эпитетов, чтобы всем, кто прочитает эти строки, стало понятно: «Люди, пока вы дышите, пока ходите по нашей прекрасной планете, пока радуетесь солнцу и небесам, цените и берегите матерей! Почаще заглядывайте им в глаза, старайтесь именно при жизни уловить в них самые трепетные, самые важные для них желания, мысли, порывы. И сделайте все возможное, чтобы исполнить их, иначе всю оставшуюся жизнь вас будут мучить кошмары несбывшейся любви и неоплаченного долга».

Михаил Григорьевич ЗНАК, журналист, юрист, подполковник внутренней службы в отставке, член Союза писателей Беларуси.

АРТ-ЖЫЦЦЁ

Васіль Быкаў на музыку ды яшчэ анлайн!

У Вялікім тэатры па абодва бакі куліс – нязвыклая цішыня. Але з суботы, 18 красавіка, ужо запушчаны штотыднёвы анлайн-праект, дзякуючы якому мы будзем слухаць і глядзець легендарныя музычныя спектаклі, у розныя гады запісаныя Беларускім тэлебачаннем. Першай трансляцыяй у сацсетках «ВКонтакте» і «Фэйсбук» стаў фільм-опера Віталя Губарэнкі «Альпійская балада».

Опера паводле аднайменнай аповесці Васіля Быкава напісана ў 1985 годзе на лібрэта Марыны Чаркашынай-Губарэнка. Яе востры сюжэт – каханне беларуса Івана і італьянкі Джуліі, уцекачоў з фашысцкага канцлагера, – заўсёды прыцягваў майстроў сумежных жанраў мастацтва. Яшчэ ў 1965 годзе на «Беларусьфільме» была створана мастацкая кінастужка (рэжысёр Барыс Сцяпанаў). А праз дваццаць гадоў – опера. Яе прэм'ера адбылася на сцэне мінскага Дома мастацтваў (цяпер гэты будынак на праспекце Незалежнасці, 25 зноў аддадзены праваслаўнай царкве, бо з'яўляецца часткай гістарычнага Архірэйскага падворка). Рэжысёрам-пастаноўшчыкам быў знакаміты Сямён Штэйн, чыя творчасць доўгія гады заставалася візітоўкай айчыннай опернай рэжысуры. Яшчэ ў 1970-я гады Штэйн спрабаваў стварыць у Мінску камерны маладзёжны оперны тэатр. І часткова рэалізаваў сваю задуму ў «Клубе сяброў оперы», які збіраўся менавіта ў сталічным Доме мастацтваў. Там і прагучала ўпершыню «Альпійская балада» на музыку аднаго з вядучых украінскіх кампазітараў стагоддзя Віталя Губарэнкі (вось прыклад сапраўднага, жывога інтэрнацыяналізму, абвешчанага ў савецкай дзяржаве). Музычным кіраўніком стаў заслужаны дзеяч мастацтваў Уладзімір Машэнскі (дарэчы, будучы ігумен Генадзь, рэферэнт Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, а потым дырэктар Мінскага духоўнага вучылішча).

Праз два гады пасля прэм'еры оперы, у 1987 годзе, на Беларускім тэлебачанні рэжысёрам Генадзем Мікалаевым быў створаны аднайменны фільм-опера. У ім бралі ўдзел таленавітыя салісты Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Наталля Руднева (Джулія) і Уладзімір Экнадзіёсаў (Іван), чые спевы прынеслі столькі асалоды гледачам у мінулую суботу. У наступныя тыдні Вялікі тэатр плануе паказ балетаў «Страсці. Рагнеда», «Анастасія», «Хто я?», опер «Мядзведзь», «Дзікае паляванне караля Стаха».

Сачыце за афішай, як прынята казаць. Пакуль усё культурнае жыццё краіны пераносіцца на экран.

Алена МАЛОЧКА.

ПАМЯЦЬ

Каму належыць Алесь Адамовіч?

Як паведамляла «Народная Воля», у канцы мінулага года ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна быў адкрыты бюст пісьменніка Алеся Адамовіча. Удзел у адкрыцці тады ўзялі раённыя ўлады. Але да гэтай пары помнік так і не ўзяты на баланс дзяржавы і лічыцца прыватнай уласнасцю мясцовага актывіста **Андруся Архіпенкі**!

Дарчы, акт ім даўно падрыхтаваны, але бабруйскія чыноўнікі вось ужо амаль паўгода не могуць яго падпісаць. Бюст усталяваны на плошчы перад пасялковым Домам культуры, і, паводле дзейнага заканадаўства, яго ўласнік павінен плаціць адпаведны падатак.

Нагадаем, што выраб і ўстаноўка помніка (аўтар – **Генік Лойка**) каштавалі больш за 13.000 рублёў, якія былі сабраны за два гады без удзелу дзяржавы.

Антон ЗАГОРСКІ.

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Паколькі ў рэдакцыі няма магчымасці рэцэнзаваць і вяртаць нявыкарыстаныя матэрыялы, яна пакідае права ўступаць у перапіску за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Падпісана ў друк 20.04.2020 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 22 326 экз. Заказ № 1220.